Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 242 (5075)
НАСТРЫЧНІКА
28
НЯДЗЕЛЯ
1934 г.
год выдання XVI

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

РЭВОЛЮЦЫЙНЫЯ ПАДЗЕІ У ІСПАНІІ

УРАДАВЫЯ ВОЙСКІ НЕ АДВАЖВАЮЦЦА НАСТУПАЦЬ НА ПАЎСТАНЦАЎ

ЛОНДАН, 27 кастрычніка. (БЕЛТА). Спецкор «Дэйлі уоркер» у Іспаніі ў паведамленні ад 25 кастрычніка з Сан-Себастыяна ўказвае, што ўрад сканцэнтраваў новыя значныя сілы артылерыі супроць астурыйскіх гарнякоў. У гарах паўстанцы маюць у сваім распараджэнні па крайняй меры 25 тыс. вінтовак і каля 150 кулямётаў. Памяма таго тысячы вінтовак схаваны ў прамысловых гарадах даліны ракі Вальрандэ. На граніцы горных раёнаў сканцэнтраваны 22 тыс. салдат урадавых войск, якія не адважваюцца ісці ўперад. Іх дзейнасць выражаецца толькі ў тым, што яны забіваюць палонных.

Праз тыдзень пасля таго, як войскі ўвайшлі ў Овіедо, паўстанцамі было пастаноўлена эвакуяваць астатнія размешчаныя ў даліне гарады і вёскі, якія вельмі трудна абараняць. Адступленне ў горы было зроблена ў бездакорным парадку. Урадавыя войскі чакалі 24 гадзіны, перш чым адважыліся рушыць да гэтых гарадоў і вёсак. Калі яны туды ўвайшлі, то пераканаліся, што паўстанцы ўжо па-за межамі дасягаемасці, у гарах.

Насельніцтва Астурыі, паводле слоў карэспандэнта, пераконана ў тым, што хутка паўстанцы зноў захопяць уладу ў свае рукі.

Артыкул тав. М. І. КАЛІНІНА

К ПЕРАВЫБАРАМ СОВЕТАЎ

Надыходзячая перавыбарчая кампанія советаў мае выключнае палітычнае значэнне. Агледваючыся на пройдзены шлях, працоўныя масы Саюза ацэняць праробленую работу, узважаць свае дасягненні, выявяць уласныя памылкі і намецяць у наказах тыя практычныя мерапрыемствы, якія забяспечаць далейшы рост і ўмацаванне пролетарскай дзяржавы. Няма сумнення ў тым, што ў працэсе перавыбарчай кампаніі на мясцах будуць падвергнуты абмеркаванню і асноўныя пытанні агульнадзяржаўнай палітыкі.

Працоўныя масы Саюза ССР тіганцкі выраслі культурна і палітычна. У народных слаях выраслa ўсведамленне дзяржаўнай цэласнасці, дзяржаўнай адказнасці. Можна з упэўненасцю сказаць, што ні ў адной краіне няма такой цеснай сувязі з дзяржавою, такой арганічнай зацікаўленасці народных мас у агульнай палітыцы дзяржавы, як у нас. І гэта натуральна, так і павінна быць. Пролетарская дзяржава, якая чэрпае сваю сілу з цеснага саюза рабочага класа з сялянствам, не можа не быць для іх блізкаю, кроўнаю, уласнаю.

Усе нашы поспехі, наш рух наперад у канчатковым выніку матэрыяльна выначаюцца выкананнем народна - гаспадарчага плана. Значыць, найстражэйшае захаванне дзяржаўнай дысцыпліны, выкананне ўсіх дзяржаўных абавязацельстваў павінна быць у цэнтры ўвагі перавыбарных сходаў як у горадзе, так і ў вёсцы. У аснове ацэнкі работы депутатаў і ўсяго совета зерцавста раёна, натуральна, павінна ляжаць выкананне даным раёнам плана хлебапастаўак і не менш важная задача — закупка хлеба.

Асеннія сельска - гаспадарчыя работы таксама не павінны быць упушчаны з поля зроку справаздачна-перавыбарчых сходаў. У бавоўнаводным раёне, разумеецца, максімум увагі павінна быць удзелена эберу і загатоўкам бавоўны. У рабочых чыгуначнага будаўніцтва ўчастка ў цэнтры абмеркавання павінна быць пытанне будаўніцтва гэтага ўчастка. Для ўсіх чыгуначнікаў, асабліва эксплаатацыйнікаў галоўным пытаннем з'яўляецца пытанне — чаму не выканваецца план чыгуначных перавозак, якім чынам забяспечыць яго выкананне.

Гэтай думкай павінна быць пранізана выбарчая кампанія ва ўсім Совецкім Саюзе і ва ўсіх галінах нашай гаспадаркі.

Да цяперашняй выбарчай кампаніі мы прышлі са значнымі дасягненнямі. Зразумела, гэтыя дасягненні далёка нам не дарам (знакі яны не лічыліся-б дасягненнямі). У іх укладзена многа працы, энергіі і настойлівасці. Памылкі ў тых ці іншых мясцах увогуле перакрываліся энтузіязмам мас.

Наша цяжкая прамысловасць выходзіць на шырокую дарогу самастойнасці. Яе рост характарызуецца не толькі тым, што яна імкнецца заняць першае месца ў свеце па выплаўцы чыгуна і іншых вырабах, але і тым, што нашы велізарныя новыя пабудовы (метрагалітэн у Маскве, другая каляіна вялікага Сібірскага шляху, новыя металургічныя, машынабудаўнічыя заводы і т. д.) узводзяцца ўласнымі сіламі, асвойваюцца абсталяваннем совецкай вытворчасці. У тэхнічных адносінах краіна становіцца менш залежнай ад капіталістычнага свету.

Развіццё прамысловасці, у прыватнасці сельска - гаспадарчага машынабудаўніцтва, дало магчымасць партыі ажыццявіць найвялікшую справу — калектывізаваць сялянскую гаспадарку і тым самым далучыць мільёны дробных распыленых гаспадарыкаў — бедняцкіх і серадняцкіх — да соцыялістычнага будаўніцтва. Зараз, калі рэзультаты калгаснай работы ў наяўнасці, калі ўжо сялян бачыць першапачатковыя поспехі калгаснай вытворчасці, калі калгасы, як форма гаспадарання, грунтоўна ўмацаваліся, можна з значнём залавлення сказаць — **перамога выдатная.** Вялікая, небывалая ў гісторыі перабудова сельскай гаспадаркі, якая ажыццяўляецца на ўзвіцятыве і пад кіраўніцтвам правадыра партыі т. Сталіна, адкрыла шырокія перспектывы ўдзелу **сялян у будаўніцтве соцыялізма.**

Грамадзянін соцыялістычнай дзяржавы не мыслиць сябеізаляванa ад працоўных усяго свету. Яго глыбока цікавяць міжнародныя адносіны і становішча рабочага класа і бяднейшага сялянства за межамі СССР. Міжнароднае становішча павінна заняць дастойнае месца ў выбарчай кампаніі. У параўнанні нашай краіны з капіталістычнымі краінамі на найбольш наглядных прыкладах яснеі відаць і рэзультаты нашай работы. Адносіны ў капіталістычных краінах поўны няўстойлівасці і няўпэўненасці ў заўтрашнім дні. Яшчэ некалькі год таму назад ваенныя замыслы кіруючых класаў глыбока хаваліся ад шырокіх народных мас. Указанне на гэтыя замыслы совецкім друкам разглядалася замежнай прэсай, як праяўленне «хворай, неўпэўненай падазронасці», а то і проста «большэвіцкай дэмагогіі».

Зараз у радзе краін вайна папулярызуецца зусім адкрыта. Ідзе бесшабашная рэклама яе, а другія краіны, карыстаючыся гэтым, узмацняюць свае узбраенні. Кіруючыя класы распіраваліся, што называецца ва ўсю.

Унутранае становішча ў большасці капіталістычных краін абвострана да апошняй ступені. Агульнапрынята тлумачыць такое становішча разбушаваўшымся сусветным крызісам. Гэта ў значнай ступені правільна, але велізарныя армії беспрацоўных стаўзаюцца і ад так званай капіталістычнай рацыяналізацыі вытворчасці, падаўжэння рабочага дня, уцягвання ў вытворчасць дзяцей, зніжэння заработнай платы, выключнага зніжэння цэн на сялянскія прадукты і павышэння на фабрычныя, што ў выніку вядзе к збліжэнню мас, змяншэнню ліку пакупцоў, зніжэнню агульнай сумы грошай на рынку, а гэта ў сваю чаргу б'е пасобных капіталістаў тымжа бервяном, якім яны ўдаюць на рабочаму класу і сялянству.

У капіталістычным свеце фронт класавай барацьбы расшыраецца з кожным днём, набываючы ўсё больш вострыя формы. І рабочы клас, не маючы іншага выхаду з таго становішча, у якое яго паставіў капіталізм, ставіць сваёй чарговай задачай непасрэдную барацьбу за ўладу, за дыктатуру рабочага класа. І сапраўды, толькі ў перамозе рабочага класа — зарука на права жыць і карыстацца дасягнутай чалавецтвам культурай.

Гажава карціна капіталістычнай сапраўднасці. Няма сумнення, што надыходзячыя перавыбары прадэманструюць перад усім светам зусім іншую абстаноўку ў нас — у краіне пролетарскай дыктатуры.

Будзем усе да аднаго ўдзельнічаць у выбарах, укладзем у гэты ўдзел той энтузіязм, напор і волю, з якімі мы перамагалі і перамагаем перашкоды, што сустракаюцца на шляху нашага росту.

Мы ператвараем у жыццё ідэалы Леніна — вызваленне чалавецтва ад усіх вігаў гэбства.

Выбіраючы ў советы лепшых людзей нашай краіны, яшчэ цяснейш згуртуемся вакол комуністычнай партыі і яе кіраўніка і прадвадыра ўсіх працоўных т. Сталіна!

ПЕРАВЫБАРЫ СОВЕТАЎ ПРАВЯДЗЕМ ПАД ЗНАКАМ РАШУЧАЙ БАРАЦЬБЫ З РЭШТКАМІ КУЛАЦТВА

Кулацкая вылазка ў Азерскім сельсавеце, Чэрыкаўскага раёна, супроць актывісткі — члена сельсовета калгасніцы Марыны Поляковай

НАПЯРЭДАДНІ ПЕРАВЫБАРАЎ СОВЕТАЎ

ПОЛАЦК, 25 кастрычніка. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).

Пад лозунгам поўнага завяршэння ільнозагатовак і ўсіх сельска-гаспадарчых работ у Полацкім раёне праходзіць падрыхтоўка да перавыбараў у Советы. У апошнія дні актыўнасць калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў значна ўзнялася. Аб гэтым сведчаць лічбы паступлення ільновалакна за апошнюю пяцідзёнку.

Да 15 кастрычніка не было ніводнай пяцідзёнкі, якая-б дала прырост больш 6 проц. Апошняя-ж пяцідзёнка з 15 па 20 ў сувязі з разгортваннем работы па перавыбарах дала прырост 14,2 проц.

Амаль ва ўсіх сельсоветах члены сельсоветаў з'яўляцца арганізатарамі абозаў з ільном і бульбай дзяржаве. РК і РВК, для яшчэ большага ўмацнення падрыхтоўкі да перавыбараў, 24 кастрычніка правялі адзіны совецкі дзень пад лозунгам поўнага завяршэння ўсіх сельска-гаспадарчых работ да перавыбараў.

Вялікую работу правялі калгаснікі сярод аднаасобнікаў па ўцягненню іх у калгасы. За апошнія два тыдні больш 200 гаспадарак уступілі ў калгасы.

Аднак, тэхнічная падрыхтоўка да перавыбараў праходзіць вельмі слаба. Да гэтага часу ні ў горадзе, ні на вёсцы няма ніводнага лозунга аб перавыбарах. Яшчэ канчаткова не разгледжаны спісы пазбаўленых выбарчых правоў па асобных сельсоветах. Невядома да гэтага часу ў сельсоветах, дзе будуць праходзіць справаздачна-перавыбарчыя сходы, а да 1 лістапада астаўся зусім малы тэрмін.

С. НЕЙДЛІН.

КУЛАЦКІЯ АГЕНТЫ ВЫКЛЮЧЫЛІ АКТЫЎНАГА ЧЛЕНА СЕЛЬСОВЕТА З КАЛГАСА

ЧЭРЫКАЎ, 26 кастрычніка. **(Ад карэспандэнта «Звязды»).**

23 кастрычніка праўленне калгаса «Перамога», Язерскага сельсовета, без усякіх падстаў выключыла з калгаса актыўную старую калгасніцу, члена сельсовета **Палякову Марыну.**

Палякова — надзвычайна актыўны член сельсовета—прымала актыўны ўдзел у правядзімых мерапрыемствах па вёсцы, у калгасе, змагалася супроць парушэнняў дырэктыў урада. Разам з тым сям'я Паляковай больш за іншых калгаснікаў выпрацавала працадзён. Некалькі раз прэміравана. Палякова часта крытыкавала дзейнасць разлажыўшагася старшыні калгаса Каверана, які зжыўся з кулацкімі элементамі.

Выключэнне праведзена напярэдадні перавыбараў, каб скампраметаваць актывістку і не дапусціць выбару яе ў совет. Палякова звярнулася ў райза, але падтрымання не знайшла. Маўчыць і сельсовет.

ФОНКАЦ.

Куставая нарада сакратароў райкомаў і начпалітаддзелаў МТС у Віцебску

Выступленне заг. с.-г. аддзелам ЦК КП(б)Б тав. Картукова

23 кастрычніка ў ГК КП(б)Б адбылася куставая нарада сакратароў райкомаў КП(б)Б, начпалітаддзелаў МТС паўночнай зоны БССР і брыгад, якія камандыруюцца ЦК у раёны для дапамогі ў завяршэнні сельска - гаспадарчых работ і паставак.

На нарадзе выступіў загадчык сельска - гаспадарчым аддзелам ЦК КП(б)Б тав. **КАРТУКОЎ.**

Вось тут зараз дакладвалі сакратары райкомаў і начальнікі палітаддзелаў. Аказваецца, што ў нас яшчэ ў значнай ступені адстаюць калгасы. Напрыклад, у Гарадку яшчэ 18 калгасаў поўнасцю не разлічыліся з дзяржавай па абавязковых хлебапастаўках. Такім чынам мы не выканалі баявога ўказання ЦК нашай партыі аб аказанні дапамогі адстаючым калгасам, аб тым, каб у нас не было адстаючых калгасаў.

Далей тав. **КАРТУКОЎ** пераходзіць да тых баявых задач, якія паставіў ЦК КП(б)Б у справе выканання асноўных сельска - гаспадарчых работ і паставак.

Мы можам і павінны ва што-б там ні стала па БССР да 1 лістапада скончыць цалкам і поўнасцю хлеба-і бульбапастаўкі, узлым зяблева па кожнаму раёну, а па ільну дабіцца да окцябрскіх свят выканання ў сярэднім па рэспубліцы не менш 65 проц. Перадавыя раёны павінны і могуць дабіцца завяршэння ільнозагатовак.

У канцы сваёй прамовы тав. **КАРТУКОЎ** выказвае ўпэўненасць, што калі таварышы возьмуцца як належыць за справу, сур'ёзна папрацуюць, то поспехі будуць забяспечаны.

10 НОВЫХ КАЛГАСАЎ

ЧАВУСЫ.

Разгарнуўшы масава-растлумачальную работу па падрыхтоўцы да VII усесаюзнага і XI усебеларускага з'ездаў советаў, а таксама да перавыбараў сельсоветаў, палітаддзел Чаўускай МТС дабіўся масавага прыліву ў калгасы.

На 20 кастрычніка ў калгасы зоны дзейнасці МТС уступіла 2.315 гаспадарак. Арганізавана 10 калгасаў. Калектывізацыя па тэрыторыі зоны дзейнасці МТС дасягае 91,3 проц.

Жаліўскі, Прудкоўскі, Галавенчыцкі сельсоветы ў асноўным закончылі калектывізацыю. Уся ўвага палітаддзела зараз звернута на арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне калгасаў і арганізацыю далейшага прыліву.

Нам. нач. палітаддзела МАРОЗАЎ.

ЛЕЙЗЕР

Сакратар Парткалегіі Камісіі Партыйнага Кантроля ЦК ВКП(б) па Беларусі.

ЗА ЖАЛЕЗНУЮ ПАРТЫЙНУЮ ДЫСЦЫПЛІНУ

Статут партыі забавязвае членаў нашай партыі «захоўваць найстражэйшую партыйную дысцыпліну, прымаць актыўны ўдзел у палітычным жыцці партыі і краіны, праводзіць на практыцы палітыку партыі і рашэнні партыйных органаў» (з статута партыі).

Наша партыя, з'яўляючыся «адзінай баявой арганізацыяй, звязанай свядомай жалезнай пролетарскай дысцыплінай», патрабуе ад кожнага ўступаючага ў партыю гатоўнасці дакладна і няўхільна выконваць усе ўказанні партыі, у першую чаргу абавязкі, пералічаныя ў статуце. Тым больш мы не можам дапускаць парушэння гэтых абавязкаў комуністамі з немалым партыйным стажам.

Пастанова Парткалегіі пра комуніста **Конанава,** якую мы сёння друкуем, з'яўляецца асаблівым папярэджаннем для кожнага комуніста. Тав. Конанаў член партыі з 1917 года. За час прабывання ў партыі быў на радзе адказных участкаў кіруючай партыйнай і гаспадарчай работы (зараз працуе загатчыкам цэнтральнага Дома селяніна). Замест таго, каб быць прыкладам для маладых членаў партыі, ён сваім антыпартыйным учынкам дзейнічае разлагаюча. Конанаў адмовіўся ад паездкі на вёску па мабілізацыі ЦК КП(б)Б.

Матывы, якія ён высунуў, нятарты члена партыі, ні чым не абгрунтаваны. Тав. Конанаў проста хацеў ухілціца ад адказнага даручэння партыі.

У сваім выступленні на актыве, камандзіраваным у раёны да завяршэння сельскагаспадарчых кампаній тав. **Гікало** асабліва падкрэсліў адставанне БССР у выкананні гэтых работ у параўнанні з вясной і летам гэтага года. Таму зараз—у адказнейшы перыяд завяршэння сельскагаспадарчых работ—камандзіроўка ЦК павінна была з'явіцца для тав. Конанава ганаровым даручэннем, якое ён абавязан быў выканаць безагаворачна, прымяніўшы сваё ўменне і накоплены вопыт партыйнай работы.

Аднак, тав. Конанаў адмовіўся выехаць у вёску, парушыўшы гэтым самым статут партыі. Парткалегія вынесла вымову т. Конанаву і абавязала яго неадкладна выехаць у раён. І ў далейшай сваёй рабоце. Парткалегія будзе строга караць усіх тых, хто пацярпае парушаць жалезную дысцыпліну нашай партыі.

Пярвічныя арганізацыі абавязаны «выхоўваць новага члена партыі так, каб ён быў здольны не на словах, а на справе ажыццяўляць важнейшыя абавязкі члена кіруючай партыі. Бо наша партыя моцна актыўнай дзейнасцю, самаадданасцю ўсёй партыі ў цэлым, кожнага большэвіка ў пасобку» (Кагановіч).

ПАСТАНОВА ПАРТКАЛЕГІІ КПК ПА БЕЛАРУСІ

ад 27 кастрычніка 1934 года

СЛУХАЛІ.

КОНАНАЎ Гаўрыіл Фёдаравіч, член партыі з 1917 г., партбілет № 0814487.

У момант разгляду справы—загадчык Цэнтральнага дома селяніна.

Абвінавачваецца ў невыкананні пастановы ЦК аб паездцы па 10 дзён упаўнаважаным ЦК у адзін з раёнаў Менскага раёна па завяршэнню с.-г. кампаніі. (Дакл. тав. Лейзер, прысутнічае Конанаў).

ПАСТАНАВІЛІ.

За адмаўленне ад паездкі па мабілізацыі ЦК КП(б)Б тав. Конанаву абвясціць вымову.

Прапанаваць яму зараз-жа выехаць у раён.

Пастанову апублікаваць у друку.

Сакратар парткалегіі КПК па Беларусі ЛЕЙЗЕР.

ЗАКУПКІ ХЛЕБА

ПОЎНАСЦЮ ВЫВЕЗЦІ НА ПУНКТЫ ЗАКУПЛЕНЫ ХЛЕБ

ВЫНІКІ ПЯТАЙ ПЯЦІДНЕЎКІ

Пятая пяціднёўка кастрычніка характарызуецца надзвычай рэзкім зніжэннем закупкі хлеба. Прырост дасягае 1,6 проц.

Галоўны тормаз у закупцы хлеба — гэта ўсё яшчэ недастаткова разгорнута работа па арганізацыі прадажы лішкаў калгаснікамі і аднаасобнікамі. Па-ранейшаму цэнтр пяжару ўсёй работы раённых арганізацый падае выключна на калгас.

Вузкім месцам і на сёнешні дзень астаецца вывазка закупленага хлеба з калгаса. Згодна дагавораў, заключаных паміж райспажыўсаюзамі і калгасамі, закуплена хлеба значна большая колькасць. Аднак, гэты хлеб, які па праву кааперацыя павінна ўжо мець на сваіх складах, калгасы не вывозяць. Па-першае, таму, што на малацьбу збожжа не звяртаюць ніякай увагі, па-другое, што з боку асобных калгасаў наглядаюцца нездаровыя тэндэнцыі:

— Хлеб мы прадалі, ці не ўсёроўна, калі мы яго вывезем.

У выніку ў такім раёне, як у Бялыніцкім, не вывезена з калгасаў 200 тон хлеба, Жлобінскім — каля 300, Слуцкім — 409 і т. д.

Па-ранейшаму слаба з вывазкай закупленага хлеба на склады Заготзярна. Палова закупленага хлеба на сёнешні дзень асела ў глыбінках.

БССР за гэту пяціднёўку зноў адышла яшчэ на 1-2 месцы назад ва ўсесаюзнай зводцы.

Задача заключаецца ў тым, каб завяршыць хлебазакупкі да окцябрскіх свят і мець гонар рапартаваць партыі і ўраду аб выкананні адной з важнейшых гаспадарча-палітычных задач.

ПЕРАДАВІКІ ХЛЕБАЗАКУПАК

ВІЦЕБСКІ РАЁН.
ДЗЯРЖЫНСКІ.
ГОМЕЛЬСКІ.
КАСЦЮКОВІЦКІ.
КІРАВІЦКІ.
ЛОЕЎСКІ.
МЕНСКІ.
ХОЙНІЦКІ.
ЧЭРЫКАЎСКІ.

ВОСЬ ХТО ЗРЫВАЕ ХЛЕБАЗА УЛКІ

БРАГІНСКІ РАЁН (сакратар РК КП(б)Б Кожар, старшыня РВК Хілімонаў, старшыня райспажыўсаюза Талкачоў).

БАБРУЙСКІ РАЁН (сакратар РК КП(б)Б Міллер, старшыня РВК Мінчонак, старшыня РСС Старавойтаў).

БУДА-КАШАЛЕЎСКІ РАЁН (сакратар РК КП(б)Б Паўзнер, старшыня РВК Буцько, старшыня РСС Турко).

ДУБРОЎЕНСКІ РАЁН (сакратар РК КП(б)Б Мышапаў, старшыня РВК Мацко, старшыня РСС Захарэнка).

ЕЛЬСКІ РАЁН (сакратар РК КП(б)Б Аўласенка, старшыня РВК Нікіпаровіч, старшыня РСС Корш).

ЖЛОБІНСКІ РАЁН (сакратар РК КП(б)Б Плешакоў, старшыня РВК Адамчук, старшыня РСС Гладкі).

КЛІЧАЎСКІ РАЁН (сакратар РК КП(б)Б Сыцкевіч, старшыня РВК Дзейка, старшыня РСС Юдкін).

ЛАГОЙСКІ РАЁН (сакратар РК КП(б)Б Цайлінгольд, старшыня РВК Анощі, старшыня РСС Зархін).

ЛЕЛЬЧЫЦКІ РАЁН (сакратар РК КП(б)Б Асінскі, старшыня РВК Гаўрусёў, старшыня РСС Рапапорт).

МСЦІСЛАЎСКІ РАЁН (сакратар РК КП(б)Б Штэйнгард, старшыня РВК Рай, старшыня РСС Падольцаў).

ПЛЕШЧАНІЦКІ РАЁН (сакратар РК КП(б)Б Паромчык, старшыня РВК Лясовіч, старшыня РСС Лукяновіч).

СТАРАДАРОЖСКІ РАЁН (сакратар РК КП(б)Б Шагалёнак, старшыня РВК Асташонак, старшыня РСС Вербін).

ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ РАЁН (сакратар РК КП(б)Б Лапацін, старшыня РВК Дупанаў, старшыня РСС Шугаеў).

ЧЭРВЕНЬСКІ РАЁН (нам. сакратара РК КП(б)Б Лебедзь, старшыня РВК Бушмін, старшыня РСС Мапы).

ЗАВОД „ПРОЛЕТАРЫЙ"

Змяшчаемы сёння нарыс гісторыі завода «Пролетарый»—ад майстэрні Фрумінс да буйнага машынабудаўнічага завода краіны Советаў — з'яўляецца яркай і наглядняй ілюстрацыяй таго аграмаднага шляху, які прайшла прамысловасць і пролетарыят нашай Беларусі. «Завод» Фрумміна—гэта капіталістычная турма. Бязлітасная эксплаатацыя, дэвядзячая рабочых да знясілення, уласнаручныя збіванні рабочых Фрумініным, кінут у адносінах усіх рабочых і спойванне найбольш каштоўных з іх, грашовая зарплата—вось што стаіць перад вачамі старыкоў-«пролетарцаў».

А «Пролетарый» зараз? Гэта перадавы машынабудаўнічы завод. Ён узброен навейшым абсталяваннем. «Пролетарый» сам вырабляе дасканалыя машыны, выцясняючы імпартныя. «Пролетарый»—гэта завод «вытворчасці» выдатных людзей.

Фрумін вырабляў медныя крэнты ды ўхваты. «Пролетарый» вырабляе вадамеры, растворамяшалкі, мотапомпы «Верцінгтон», пяціагрэгатныя печы «Пінча» (імпартная такая печ каштавала 32 тыс. рублёў золатам) і гордасць завода — малаапрэцоўчы варштат Калава. Хіба гістарычны шлях завода не адбівае сабой шляху ўсёй Беларусі—зд саматужных майстарань і дробных заводзікаў да Гомсельмаша, шаўковай, Белдрэс, «Сцяга індустрыялізацыі», Бабруйскага камбіната і іншых гігантаў БССР.

Але «Пролетарый» выдатны не толькі і не столькі машынамі. Ён выдатны сваімі кадрамі. «Пролетарый» ужо даў краіне не адзін дзесятак інжынераў, рассеяных па ўсяму неасяжнаму СССР. У Фрумініна «інжынераў» можна было пазнаць толькі па ШАПЦЫ. На справе гэтэ былі «ліпавыя» інжынеры. П'яніцы Кароўня, які сам прызнаўся, што ён нічога ў тэхніцы не разумее,—вось хто быў тэхнічным «мозгам» Фрумініна. Завод «Пролетарый» мае цэлую групу інжынераў. Але самае выдатнае ў тым, ШТО АСНОЎНАЯ МАСА «ПРОЛЕТАРЦАЎ» САМА АЎЛАДАЛА ТЭХНІКАЙ. Тэхнічная культура «пролетарцаў» настолькі вырасла, што яны ставяць пытанне аб ператварэнні свайго завода ў завод-вуз.

СТАРЫЯ «пролетарцы» любяць і ганарацца сваім заводам. Гэта самая глыбокая любоў, якая існуе ў масе. Гэта любоў да СВАЙГО завода, да сваёй соцыялістычнай радзімы. Каму-ж, як не ім, адчуўшым уціск царызма і Фруміных, грудзьмі абараняўшых Гомель і завод у грамадзянскай вайне, на сваіх плячах вынесшых цяжар яго адбудавання і расшырэння, — любіць і ганарыцца сваім заводам. І мудра паступаюць заводскія арганізацыі, заўсёды мабілізуючы калектыўны розум гэтых старых кадравікоў. Але ў «пролетарцаў» ёсць і маладая дасканалая змена. Задача старых — перадаць ім не толькі свой тэхнічны вопыт, АЛЕ І СВОЙ ПРОЛЕТАРСКІ ЗАПАЛ, СВАЮ НЯНАВІСЦЬ ДА ЭКСПЛААТАТАРАЎ, СВАЮ ВЯЛІКУЮ ЛЮБОЎ ДА ВЫСТРАДАНАЙ І КРЫВЁЙ ЗАВАЯВАНАЙ ДЫКТАТУРЫ ПРОЛЕТАРЫЯТА.

Завод «Пролетарый» ідзе ў перадавых радах прадпрыемстваў БССР. На яго сценах развіваецца рад сцягаў, завяваных ім у вытворчых баях. Няхай іншыя прадпрыемствы Гомеля і БССР вучацца ў «пролетарцаў» аўладанню тэхнікай.

Мы не сумняваемся ў тым, што XVII гадавіну Окцябра «Пролетарый» сустрэне з новымі вытворчымі перамогамі, з новымі перамогамі на фронце паляпшэння культурна-бытавога становішча сваіх рабочых.

ПАБЕДАНОСНАЕ НАСТУПЛЕННЕ КІТАЙСКАЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

ТОКІО, 26 кастрычніка. Агенцтва **«Дэмпо цусін»** паведамляе з Кантона, што **80-тысячная кітайская чырвоная армія,** у якую ўваходзіць 50-тысячны атрад пад камандай **Чу-Дэ,** 10-тысячны атрад пад камандай **Пэн Дэ-хуай** і 20-тысячны атрад пад камандай **Мао Цзе-дуна,** наступае з правінцыі Цзянсі ў правінцыю Гуандун. У раёне **Сінфін і Аньюань** (паўднёвая частка Цзянсі, каля граніцы Гуандуна) адбываецца бой кітайскіх чырвоных армій з войскамі кантонскага ўрада. З прычыны труднасцей, адчуваемых войскамі кантонскага ўрада,—паведамляе агенцтва,—на месца бою накіраваны з Гуандуна авіяцыйныя часці. (БелТА).

ПАРАЖЭННЕ КАНТОНСКАЙ АРМІІ

ТОКІО, 26 кастрычніка. (БЕЛТА). Ганконгскі карэспандэнт агенцтва **«Сімбун рэнго»** паведамляе, што кантонскія войскі ў баях з кітайскай чырвонай арміяй панеслі цяжкія страты ў раёнах Сіньфіна і Аньюаня (правінцыя Гуандуна). Адна брыгада кантонскіх войск знішчана.

* * *

ЛОНДАН, 27 кастрычніка. (БЕЛТА). Ганконгскі карэспандэнт **«Ньюс кронікл»** указвае, што баі адбываюцца на ўсіх франтах ад Даюй да Чжунмыліна. У баях прымаюць удзел дзве кантонскіх паветраных эскадрыльі.

На тэмы дня

Дамы соцкультуры

Культурныя патрабаванні шырокіх калгасных мас за апошнія гады незвычайна ўзраслі. У калгасе аграмадны попыт па кнігу і газету, будуюцца спартыўныя пляцоўкі, арганізуюцца фізкультурныя гурткі, футбольныя каманды і т. д. Зусім нядаўна ў Менску адбыўся футбольны матч паміж калгаснымі футбольнымі камандамі Кармана і Дуні. Адначасова з ростам заможнасці расце ў калгасах і культура.

Аднак, работа палітыка-асветных устаноў у вёсцы (дамы соцыялістычнай культуры, хаты-чытальні, чырвоныя куткі) рэзка адстае ад патрабаванняў калгаснікаў. Герш таго. Раённыя арганізацыі ў большасці сваёй не клапоцяцца аб паляпшэнні работы гэтых устаноў, а часамі нават срываюць яе.

Работнікі суражскага дома соцыялістычнай культуры ў пісьме ў «Звязду» пішуць, што два месяцы таму назад райвыканком аддаў чытальню, бібліятэку і ўсе пакоі, зарана залы, пад кантору Заготзярно. Зараз і зал ператварылі ў склад.

Зразумела, і склад, і кантора Заготзярно вельмі патрэбны. Але няўжо для іх нельга было знайсці другога памяшкання, апрача дома соцкультуры? Безумоўна, можна было. Замест гэтага тупагаловыя чыноўнікі з райвыканкома галічылі найбольш мэтазгодным тэзбавіць суражскіх працоўных адзінага месца культурнага адпачынку.

Трэба спадзявацца, што суражскі выпадак—адзін з нямногіх. Але факт астаецца фактам: палітыка-асветная работа на вёсцы культурнае на абедзве нагі.

Надыходзіць зіма. Неабходна зараз стварыць усе ўмовы для разгортвання работы дамоў соцкультуры, хат-чытальнь, чырвоных куткоў, падрыхтаваць памяшканні да зімы, пабяліць, пафарбаваць іх, прывесці ў культурны выгляд. Неабходна правесці работу па ўстановах, адрамантаваць. Бібліятэкі трэба папоўніць новымі кнігамі.

Асаблівая ўвага разгортванню фізкультурнай работы, у асаблівасці зімовага спорта!

Ператворым дамы соцкультуры, хаты-чытальні ў месца сапраўднага культурнага адпачынку і асветы мас калгаснікаў!

Гомельскія арганізацыі прамаўчалі. «Палеская праўда» таксама.

Што-ж замоўчвалі ў Гомелі?

«Гомельскі раён зусім зрывае апрацоўку і здачу ільновалакна», —так адзначыла цэнтральная камісія па спаборніцтву з Заходняй вобласцю, апэньваючы ход сельска-гаспадарчых работ па раёну за першую пяцідзёнку кастрычніка.

Вось гэта і замаўчалі гомельскія арганізацыі і рэдакцыя «Палескай праўды».

9 кастрычніка на старонках газеты змяшчаецца раённая зводка аб ходзе сельска-гаспадарчых работ за першую пяцідзёнку месяца.

Дзіўная, мякка кажучы, зводка. Паказальнікі аб ходзе ільнозагатовак зусім не ўключаны ў зводку. Адным словам, людзі рашылі ўтаіць, што ў раёне апрацоўка і здача ільновалакна зрываецца. Гомельскі земаддзел па меры сваіх сіл і магчымасцей стараецца захаваць шыла ў мяшку. Рэдакцыя «Палескай праўды» з свайго боку прымае непасрэдны ўдзел у гэтай рызыкоўнай справе.

Ва ўсім нумары—ні аднаго слова аб ільне. Характэрная рыса. У тым-жа нумары рэдакцыя змяшчае матэрыялы аб раённай нарадзе старшынь сельсоветаў.

Старшыні сельсоветаў, як паведамляе «Палеская праўда», абавязаліся:

«...забяспечыць выкананне ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній: поўную здачу бульбы, закупкі хлеба, выкананне фінплана, уздым зяблёва, выкананне песазагатовак, падрыхтоўку да зімы».

А ільнозагатоўкі? Ані слова. Рэдакцыя знімае лён з парадку дня. І гэта ў той час, калі «Гомельскі раён зрывае здачу ільновалакна». І гэта ў той час, калі камісія па спаборніцтву з Заходняй вобласцю заносіць раён кандыдатам на чорную дошку.

Схаваць шыла ў мяшку не ўдалося. У Гомель прыбываюць цэнтральныя газеты, у якіх апублікавана пастанова цэнтральнай камісіі па спаборніцтву.

Воляй-неволяй прыходзіцца гаварыць аб тым, што рэдакцыя так настойліва абмінала.

12 кастрычніка «Палеская праўда» робіць свой першы крок. Яна выступае з аншлагам:

«Усе сілы — на хутчэйшую апрацоўку і здачу высокаякаснага ільну дзяржаве».

А пад аншлагам — літаральна ўводнай заметкі аб ходзе апрацоўкі і загатовак ільну.

У наступным нумары — такая-ж карціна. Розніца хіба толькі ў тым, што рэдакцыя больш не робіць рэверанса. Няма ні аншлага, ні матэрыялаў аб ільне.

14 кастрычніка «Палеская праўда» змяшчае зводку за другую пяцідзёнку. На гэты раз земаддзел, нарэшце, уключае графу аб ходзе ільнозагатовак. У графе — пераважна адны нулі. Агульны паказальнік па раёну — 0,3 проц. плана.

Можа хоць цяпер рэдакцыя дае матэрыялы аб ходзе ільнозагатовак, **сыкрыває сабатажнікаў апрацоўкі і здачы ільну,** паказвае, па чыёй віне зрываецца выкананне плана?

Бестурботнасць, тое-ж упартае ігнараванне ільну.

Возьміце нумар за 18 кастрычніка, дзе змешчана чарговая раённая зводка.

Пад зводкай аншлаг:

«ПЕРАКЛЮЧЫЦЬ СІЛЫ НА АПРАЦОЎКУ ІЛЬНУ і т. д.».

У зводцы — ганебнейшы паказальнік: план ільнозагатовак выкананы па раёну ўсяго на 0,9 проц.

Пад зводкай — зноў ніводнага матэрыяла з месц, ніводнай заметкі аб найбольш адстаючым сельсавеце, ніводнага радка аб раённых арганізацыях, дапускаючых зрыў ільнозагатовак.

І калі газета пачынае займацца, так сказаць, замакрытыкай, то ўсё падгаджвае, усё абязлічвае.

20 кастрычніка «Палеская праўда» пісала:

«Наш раён есабліва злэчыкна адстае па зяблёву і здачы ільновалакна дзяржаве».

І вось газета пачынае называць пінаватых:

«Многія работнікі вёскі і нават кіраўнікі ведамственных арганізацый, як гарэз і МТС, разважаюць так: «Мы — не ільнаводчы раён» і т. д.».

Ніводнага прозвішча. Ніводнай спробы рашуча паставіць пытанне аб адказнасці за недаацэнку ільну, за зрыў загатовак. Газета толькі смела пускаецца ў плаванне серод фраз аб «многіх работніках».

Гомельскі раён зрывае не толькі ільнозагатоўкі, але і ўздым зяблёва, мясапастаўкі і іншыя гаспадарча-палітычныя кампаніі. Не раз раённае кіраўніцтва было папярэджана.

Гарком і горсавет не ўлічылі гэтых папярэджанняў. Па выкананню сельска-гаспадарчых работ і загатовак Гомельскі раён ідзе на самым апошнім месцы і цяпер занесен на чорную дошку.

«Палеская праўда», аднак, старанна ахоўвае гонар мундзіра. Паглядзіце на апошнія нумары. Крыклівыя аншлагі і ніякіх матарыялаў, прасякнутых сапраўднай большэвіцкай самакрытыкай, мабілізуючых партарганізацыю на сапраўдную большэвіцкую работу.

Вось, напрыклад, нумар за 22 кастрычніка. На пяць калон буйным шрыфтам аншлаг:

«НЕ ДАПУСЦІЦЬ ЗАНЯСЕННЯ РАЕНА НА ЧОРНУЮ ДОШКУ».

Якія-ж матэрыялы змяшчаюцца пад гэтым трывожным аншлагам?

Падабраны выключна толькі станоўчыя факты. А аб прычынах, прывёўшых раён на самае апошняе месца ў рэспубліцы па выкананню гаспадарча - палітычных кампаній — ні слова.

І нарэшце нумар за 25 кастрычніка.

На першай паласе ў куточку змяшчаецца пункт з пастановы камісіі па спаборніцтву з Заходняй вобласцю:

«Дадатковa занесці на чорную дошку Гомельскі раён, які ганебна зрывае плян ільнозагатовак (75 месца) і адстае па мясапастаўках і ўздыму зяблёва».

«Палеская праўда» скромна ўніка ўсякіх каментарыяў. Ні слова ад сябе. Ні слова аб адставанні раёна. Ні намёку па тое, што трэба мабілізаваць усе сілы, каб вывесці раён з чорнай дошкі. У сілу неабходнасці змяшчаюць пастанову камісіі, а самі робяць выгляд, што гэта іх зусім не датычыць.

І калі-б не пастанова камісіі, чытачы «Палескай праўды» так і не даведаліся-б аб становішчы ў раёне.

Устае пытанне — ці думае рэдактар «Палескай праўды» т. **Бугроў** праводзіць у жыццё рашэнне ЦК ВКП(б)? Ці разумее ён, што адсутнасць кожнага кіраўчага работніка Гомеля рэалізаваць гэта рашэнне правяраецца **справамі,** правяраецца не ў апошнюю чаргу яго ўменнем разгарнуць крытыку і самакрытыку?

Агляд друку

АБ ІЛЬНОЗАГАТОЎКАХ І САМАКРЫТЫЦЫ

„Палеская праўда", Гомель

КРУПСКІ РАЙКОМ НЕ КІРУЕ ПАРТВУЧОБАЙ

З чаго пачалі падрыхтоўку ў **Крупках** да новага навучальнага года ў сетцы партасветы?

Па традыцыі, з пастановы. Зразумела, між іншым, што гэта пастанова не даведзена да партыйцаў, яна ніяк афармляецца ў апарацэ райкома.

І яшчэ «заваставілі ўвагу» на кант вучобы на адной нарадзе старшынь сельсоветаў, якую правялі РВК.

І яшчэ праведзен двухдзённы прэсэмінар.

З 1 да 5 кастрычніка ва ўсёй сетцы школ партасветы павінны былі гравіцца арганізацыйныя заняткі. **Ніхто з раённага партактыва не выехаў на месца для ўдзелу ў першых занятках.**

Выехаў толькі, як заяўляе інструктар РК тав. **Лісава,** адзін работнік для таго, каб «паглядзець, што робіцца». Інструктар тав. **Благуцін** яшчэ выпісвае са сшытка Лісавай у свой блакнот «сетку партшкол па арганізацыях, якія ўваходзяць у яго абсалютоўванне». Сама Лісава зараз занята... размеркаваннем па школах сшыткаў і алоўкаў.

Не дзіва, што пры такой «арганізацыі» першыя заняткі ў большасці школ сарваліся. 2 кастрычніка павінна была ў Крупках працаваць партшкола навышэйшага тыпу для раённага партактыва, але заняткі не адбыліся, бо ў гэты дзень засядаў прэзідыум РВК з раніцы да 1 гадзіны ночы. У Крупскай кандыдацкай школе так сама заняткі сарваліся, бо кіраўнік гэтай школы яшчэ не вярнуўся з адпачынку. Словам, такой безліч «аб'ектыўных» прычын і амаль усюды сарваны першыя заняткі.

Зусім інакш падышоў да арганізацыі партвучобы палітсакрэт у зоне МТС. Задачы павышэння ідэйнага ўзроўня комуністаў і практычныя пытанні арганізацыі марк-ісцка-ленінскага выхавання шырока абмеркаваны на сходзе партыйцаў і спачуваючых. Праведзена нарада прапагандыстаў разам са старастамі. Напярэдадні заняткаў нам. нач. палітаддзела тав. **Вішнінская** праверыла комплектаванне кожнай школы. У першы дзень вучобы—1 кастрычніка — усе работнікі палітаддзела прынялі ўдзел у правядзенні арганізацыйных заняткаў.

Партыйцы і спачуваючыя пачалі вучобу з поўным усведамленнем задачы павышэння ідэйнай узброенасці кожнага комуніста, пастаўленай XVII з'ездам партыі. Аб гэтым сведчыць стопроцантная явка партыйцаў і спачуваючых на заняткі ў школах (з 7-мі спачуваючых), добрая арганізацыйная падрыхтоўка да заняткаў (памяшканне, святло і т. д.).

Кожны слухач забяспечан падручнікамі па праграме. Паміж школамі разгортваецца соцспаборніцтва на стопроцантнае наведванне заняткаў і лепшае асваенне праграмы.

Школы забяспечаны кіраўнікамі. Нядбалым было вылучэнне толькі **Бардзілоўскага** кіраўніком заняткаў у школе пры калгасе **«Перамога», Жаберыцкага** сельсавета. Нядбалым таму, што гэты чалавек толькі што прыцягваўся райкомам КП(б)В да суровай партыйнай адказнасці за «лявацкае» адміністраванне. Аднак, з гэтага спачування Бардзілоўскі не зрабіў для сябе ніякіх вываўдаў. Ён па-ранейшаму, па-ранейшаму цельку адносіцца да ўсякай выхаваўчай работы. У першы дзень заняткаў Бардзілоўскі разаслаў усіх партыйцаў па вёску. Прыехаўшаму з палітаддзела для правядзення арганізацыйных заняткаў тав. Зуёнку Бардзілоў заявіў: **«Вучоба неабходная гэч, але займацца цялер няма калі».**

Такой думкі прытрымліваюцца многія ў **Крупскай** партыйнай арганізацыі. Гэтым і тлумачыцца зрыў першых заняткаў у большасці школ партасветы гэтага раёна.

Я. ІВАШЫШ

Пісьмы рабочых і калгаснікаў

НАМ. САКРАТАРА МЕНГАРКОМА КП(б)Б тав. ХАДАСЕВІЧУ.

ЗЛАДЗЕІ НЕ ПРЫЦЯГНУТЫ ДА АДКАЗНАСЦІ

(Пісьмо калгаснікаў).

У калгасе імя Фалько, Грышанскага сельсавета (Менскі раён) арганізавалася цёплая сямейка, як: старшыня калгаса Халадзінскі, члены праўлення Дано С., Зайцаў П., Палітанскі Іван. Яны прадалі 76 пудоў калгаснай бульбы і грошы прысвоілі.

У калгасе поўная безгаспадарчасць. С.-г. машыны валяюцца пад адкрытым дахам (жняярка-самавязка, касілка ўжо паржавелі). Былы кладаўшчык Дзяргай Іван (зарэз учотчык) разбазарыў 10 пудоў збожжа і да яго ніякіх мер не прынялі.

У 5-й брыгадзе знаходзіцца кулак Яромка Павел Янкаў. Да ўступлення ў калгас ён меў 11 га зямлі, два кані, тры каровы, пяцёра свіней. Трымаў двух сталых батракоў. Будучы загатчыкам малочнай фермы, ён разбазарыў малочныя прадукты (за што быў знят з працы), але-ж ён і зарэз працуе ў калгасе і школдзіць.

Крытыка і самакрытыка ў калгасе зажата. Калгаснікі баяцца выступаць на сходах, выкрываць недахопы. За кожнае выступленне пагражаюць знятцем з работы.

ХАДАРКЕВІЧ, ШЧАЎКУН.

***

(Ад карэспандэнта «Звязды»)

Факты, указаныя ў пісьме калгаснікаў, пацвердзіліся.

У калгасе — поўная безгаспадарчасць, п'янства, прытупленне класавай пільнасці з боку членаў партыі.

Члены праўлення Дано, Зайцаў, Палітанскі І. прадавалі вясной калгасную бульбу і частку грошай прысвоілі.

Пры такім «кіраўніцтве» ў калгасе пачасціліся пакражы. У жніўні ўкрадзены дзве авечкі. Трактарыст украў адзін мяшок збожжа. Безгаспадарчасць прывяла к таму, што на дварэ калгаса пад адкрытым дахам стаяць сельскагаспадарчыя машыны і іржавеюць.

— Усё роўна машыны старыя і іх трэба здаць у ўціль, — гаворыць брыгадзір Зайцаў. Жняярка-самавязка паржавела стоячы больш месяца на полі пасля ўборкі. Брыгадзір Зайцаў па-шкодніцку склаў стог сена, які прамок вадой.

Старшыня калгаса Халадзінскі і парторг займаюцца самаснабжэннем. Яны зарэзалі двух баранаў і мяса падзялілі.

У брыгадзе «Чырвонай слабады» учотчыкам працуе былы кулак, які меў 25 га зямлі, 8 кароў і карыстаўся поўнай сілай. Ён, будучы кладаўшчыком, укрыў калгаснае збожжа (жыта 40 пудоў, аўса 22 пуды, капюшыны паўтара пуда; ён-жа прысвоіў 10 пудоў калгаснай мукі.

Крытыка і самакрытыка ў калгасе не разгорнута. У прысутнасці членаў праўлення калгаснікі баяцца выступаць, каб іх не выключылі з калгаса. Культмасавая работа ў калгасе не праводзіцца. Калі калгаснікі звяртаюцца да парторга т. Айзікава па якой-небудзь справе, той адказвае: «Што вы да мяне маеце... мая справа — палітычная». Пастановы праўлення калгаса не даводзяцца да калгаснікаў.

ЛАНЬКОЎ.

ЗАМ. НАРКОМА МЯСНОВАЙ ПРАМЫСЛОСАСЦІ тав. СВІРЫДАВУ

ЧАМУ АСТАНАВІЎСЯ МЛЫН?

(Пісьмо калгасніка)

Млыны Плешчаніцкага раёна,— як комгасныя, так і калгасныя— сапсаваліся таму, што на працягу 3-х год яны не атрымліваюць ніякага млынавага інвентара.

Млын Прусаўская-Чэрыца пры добрым абсталяванні змог-бы даць дзяржаве 677 цэнтнераў у год памольнага збору. Але ён бездзейнічае.

Калгаснікам і аднаасобнікам з прычыны, бядзейнасці РВК, прыходзіцца траціць шмат часу, каб змалоць зярно.

Раённае кіраўніцтва комгаса не ждае. Улічыць, што з-за адсутнасці млына калгаснікі пачалі пераапрацоўваць зярно праз жорны, чым змяншаецца памольны збор.

ШЫДЛОЎСКІ.

САКРАТАРУ МАГІЛЕЎСКАГА РК тав. РЭВІНСКАМУ.

„ВЫ НЕ ЦУКАР, НЕ РАЗМОКНІЦЕ"

(Пісьмо студэнта)

Магілеўскі палітасветкамбінат сустрэў навучальны год зусім не падрыхтаваным. У інтэрнаце шыбы павыбіваны, дах працякае.

Не вядзецца барацьба з антысанітарыяй. У інтэрнаце брудна. Пад самымі вокнамі пабудавалі прыбіральню.

Праход да памяшкання зараз зачынен, бо дзверы закіданы дровамі.

Дах інтэрната паломан, пасцельныя прылады прамакаюць. Калі студэнты звярнуліся да дырэктара, каб рэагаваў на гэтыя з'явішчы, ён адказаў: «Вы не цукар, не размокніце».

ЛАПКОЎСКІ, ПРАСАЛОВІЧ і іншыя (усяго 9 подпісаў)

ШЭСЦЬ ТЫДНЯЎ У ЗНЯВОЛЕННІ Ў КОЛУМБІЯГАУЗ

Артыкул т. ВЕРНЕРА ГІРША, б. галоўнага рэдактара Ротэ фане у Берліне, НАПІСАНЫ СПЕЦЫЯЛЬНА ДЛЯ „ЗВЯЗДЫ"

У большасці выпадкаў зняволеныя атрымлівалі ледзь дзесятую частку пакетаў, а астатняе пападала ў шафы СС. Асобныя скаргі некаторых зняволеных выклікалі ў якасці адказу яшчэ больш агідныя здзекі.

Шмат раз адбываліся таксама выхадкі сексуальнага характару. Напрыклад, напярэдадні каляд 1933 года СС прымусілі некалькіх маладых яўрэяў-зняволеных раздзецца і займацца ананізмам. Асабліва агіднае становішча было ў так званым яўрэйскім бараку, дзе адзін са зняволеных, рускі белагвардзеец Дзімітрыеў, пад аховай і пры актыўным падтрыманні СС рабіў самыя дзікія здзекі з яўрэйскага зняволенага.

З Брандэнбурга я быў дастаўлены ў Лейпцыг, як сведка па справе падпалу рэйхстага. У часе майго допыту разгарнулася, між іншым, добрая палітычная палеміка вакол пытання, ці была ў наяўнасці рэвалюцыйная сітуацыя ў Германіі і ці падрыхтоўвала КПГ паўстанне. На наступны дзень, калі я быў ужо зноў дастаўлены ў Брандэнбургскі лагер, «Фелькішэр беобахтэр» абмяркоўваў, зразумела ў правакацыйнай форме, мае выказванні. Мяне зноў, як гэта ўжо стала звычайным у фашысцкай прэсе пасля гітлераўскага захвату ўлады, называлі «жыд Гірш з «Ротэ фане». Агульная думка пашых таварышоў у Брандэнбургу схілялася да таго, што гэты артыкул і мае паказанні, як сведкі, немінуча пацягнуць за сабой новую хвалю рэпрэсій. Пры пануючай агульнай салідарнасці, таварышы як у маім памяшканні, так і ў астатнім лагеры, нервяваліся, чакаючы, што СС са мной зробіць.

Аднаго разу ноччу, праз тры дні пасля майго звароту з Лейпцыга, я быў выклікан знянацку, пасля таго як я ўжо лёг спаць. Мне прыйшлося апрануцца і сабраць свае рэчы. Пад уплывам агульных настрояў, я чакаў звычайнай «спробы ўцячы». Тым радасней было маё здзіўленне, калі мяне даставілі ў Берлін і прывялі ў паліцэйскую турму на Александэрплац. Хоць там і было шмат клопаў у маёй камеры, але-ж наступная ноч, калі я быў застрахаван ад яжіх-небудзь нечаканых візітаў катаў СС, была, напэўна, самай шчаслівай ноччу майго жыцця. Камера мая ў параўнанні з Брандэнбургам здавалася мне санаторыем. Але-ж мары хуткім тэмпам ішлі да канца. Наступнай раніцай мяне павялі ў гестапо на Прынц-Альбрэхт-штрасэ. Там камісар мне растлумачыў са злой усмешкай: «Мы змесцім вас цяпер у такое месца, дзе-б вы маглі добра абмеркаваць тое, што вы гаварылі аб палітыцы КПГ ў Лейпцыгу».

Гэтым месцам быў Колумбіягауз.

Калі мяне туды прывялі, я яшчэ не ведаў, дзе я знаходжуся. Толькі праз 10 або 12 дзён я зразумеў гэта, — калі мне прадставіўся выпадак перакінуцца шэптам некалькімі словамі з адным са зняволеных, маім знаёмым. Дзверы маёй камеры былі ўпрыгожаны надпісам: «Не павінен пакідаць камеры». Гэта мела сваім вынікам, што я толькі адзін раз напярэдадні каляд, меў нешта накшталт прагулкі ў вольны час на двары.

У камеры, дзе знаходзіліся толькі сянік, нары, коўдра, міска для яды і кубак для піцця, зняволены не меў права мець пры сабе граёбенку ці зубную шчотку. Начны сон прыблізна праз кожныя поўгадзіны парушаўся СС, якія будзілі нас ад 10 да 17 раз на ноч. Як падставу для такой змораваючай палітыкі, СС высоўвалі небяспеку самазабойства зняволеных.

Аднак, самым страшным з нашых пакут у гэтай турме была немагчымасць мала-мальскі зносна га адпачыння сваіх натуральных патрэб. З прычыны таго, што ў камерах былі або клазеты, або нарэшты, зняволеным вельмі рэдка прадастаўлялася магчымасць выйсці за межы камеры ў так званую «прамежкавую камеру». Але-ж гэта суправаджалася такімі здзекамі, што былі ў Калумбіягаўз зняволеныя, якія сапраўды на працягу чатырох тыдняў не больш чатырох або пяці раз наведвалі клазет. Важнай праблемай, якой займаліся цэлы дзень, было пытанне, якім чынам ужываць магчыма менш вадкасці. У некаторых зняволеных гэтыя пакуты ўзмацніліся яшчэ тым, што СС прымушалі іх прымаць рыцыну.

Само сабой зразумела, што зняволеным не дазвалялася атрымліваць ніякіх газет ці кніг, што ўплывала самым расслабляючым чынам пры адзіночным зняволенні. Мы маглі сабе толькі ў гэтым сэнсе дапамагчы тым, што мы штодня выпрацоўвалі сабе поўную праграму розных праблем, якія мы абмяркоўвалі і ў поўнай меры самі з сабой абгаварвалі з тым, каб трымаць мозг свежым і ўбіць час.

СС скрозь і ўсюды называлі зняволеных па-берлінску: «паўле». Таму самі СС у нашых гутарках фігуравалі пад гэтым самым імем. Аднаго з іх мы звалі «паўле-пашчочына». Калі ён дзяжурыў, ён сістэматычна заходзіў у кожную камеру, станавіўся моўчкі супроць сваёй ахвяры і раптам біў яго зусім без падставы і без усякай прадмовы. Другі быў так званы «паўле-каленазгібацель». Калі ён дзяжурыў, ён аддаваў загады такога парэдку: «Ты зробіш 50 каленапракланенняў». Калі ахвяра зусім стамлялася і ледзь пераводзіла дух, ён растлумачваў калюча: «Ты цяпер усхваляваны і запыхаўся. Калі ты супакоішся, ты адразу-ж зробіш яшчэ 100 каленапракланенняў». Зусім асобным спортам, які выклікаў уражанне, псіхіятрычнай лячэбніцы, была так званая «паветраная трывога». Гэта здабывалася так, што СС, калі яны мелі свабодны час, раптам пачыналі крычаць у калідоры: «па ветраная трывога». Зняволеныя, якія хацелі ўнікнуць збівання, павінны былі пры гэтым сігнале лезці пад нары і дажыцца там у гразь.

Значна горшымі былі адносіны да некаторых асобных зняволеных. Быў, напрыклад, там малы-ькі калека, які ўжо сядзеў прыблізна поўгода ў Колумбіягаўз. Ён збівпавачаўся ва ўдзеле ў сутычцы, пры якой быў забіт штурмавік. Хоць не было ніякіх доказаў гэтага падазрэння, гэты чалавек ўсё-ж доўно ўжо быў асуджан. Гэты няшчасны калека, зусім загаладаўшыйся і пахудаўшы, які нагадваў сабой недаростка-школьніка, у той час, як яму было мабыць год 30, штодзённа збіваўся. СС называлі яго не інакш як «ты, гарбатая брудная свіння». Калі яны адпіралі яго камеру, ён павінен быў з бадзёрай выпраўкай сказаць наступную формулу: «Я забойца». Звычайна за гэтым паступалі штуршкі і пабоі. Цяжка ўявіць сабе, што такое слабае цела вытрымала, не зламаўшыся, такія доўгія пакуты.

Апагеем сцэн збівання быў так званы «склеп». Гэта былі самыя дзікія экзекуцыі супроць асобных зняволеных. Гэтыя здзекі дзяліліся на ступені: «сіла ветра ад 1 да 5». Калі справа ішла аб «сіла ветра 3», ахвяра пасля збівання пападала да доктара. Пасля «сіла ветра ад 4 да 5» ахвяры выносіліся на насілках са склепа.

Да самых зверскіх учынкаў, якія адбываліся ў Калумбіягаўз, адносіліся тыя, пры якіх некаторым зняволеным рабіліся ўліванні камфары і салянай кіслаты ў палавыя органы. Са страшнымі ўнутранымі пашкоджаннямі і абжогамі, са зруйнаванымі ўнутранасцямі гэтыя няшчасныя пераводзіліся з Калумбіягаўз у паліцэйскую турму на Александэр-плац або ў дзяржаўную больніцу. Гэтыя выпадкі, ахвяры якіх многія з маіх знаёмых зняволеных бачылі ўласнымі вачамі, мелі месца за некаторы час перад маім зняволенням у гэту турму.

Я асабіста вынес з Колумбіягаўз хворае калена, якое патрабуе двух-або трохмесячнага лячэння. Параўнаўча з маімі папярэднімі пакутамі ў Брандэнбургскім лагеры, Колумбіягаўз быў для мяне кроцкам наперад. Але гэта магло скласціся зусім інакш. Пазней, калі мяне перавялі ў канцлагер Аранінбург, мне адзін са зняволеных, таксама пераведзены з Колумбіягаўз, расказаў аб выпадку, які адбыўся ў Колумбіягаўз 12 снежня.

У гэты дзень гэты таварыш з т. Шэрам былі разам адведзены ў адзін са склепаў Колумбіягаўз. Ахранник, які іх даставіў туды, запытаў гэтага таварыша: «Ці ведаеш ты гэтага?» Ён адмаўляў.

«Што, ты, свіная морда, не хочаш ведаць правадыра КПГ?»

Тав. Шэр умяшаўся, жадаючы абараніць другога: «Гэта зусім магчыма, мяне мала ведаюць у Берліне, бо я ласта выступаў толькі ў Гамбургу і Гановеры». СС растлумачыў другому таварышу: «Ну, Шэру мы ўжо паказалі, які тут вецер дзме. Жыд Гірш з «Ротэ фане» яшчэ не да таго дажыве».

У гэты час я быў ужо чатырнаццаты дзень у Колумбіягаўз. Гэты чалавек павінен быў толькі падняцца адным паверхам вышэй, каб знайсці мяне. Тут мяне вырятавала тая акалічнасць, што з моманту зняволення вы ўжо існуеце толькі як нумар. Я, напрыклад, называўся № 1975. І гэта інкогніто пад нумарам 1975, відавочна, выратавала мяне ад новых цяжкіх здзекаў. Героем Колумбіягаўз быў т. Шэр. Яму прышлося перацярпець самыя зверскія пакуты і ён перацярпеў іх самым блістучым чынам. Некалькі тыдняў пасля майго пераводу з Колумбіягаўз у Аранінбург т. Шэр з таварышамі Шэнгерам, Штэйнфуртам і Шэрцам быў аднойчы ветарам выведзен з Колумбіягаўз і расстраляны ў лесе. Ён быў забіт таму, што яго хацелі знішчыць, як сведку абароны т. Тэльмана, хаценні закрыць яму рот. Калі ўсе пуць у гэтым напрамку, не змаглі нічога дасягнуць асабіцца, фашысцкія забойцы рэвальвера.

ДА XVII ГАДАВІНЫ ОКЦЯБРА

Завод „Пролетарый"

Сцягі, заваяваныя заводам «Пролетарый».

1. Завод

— Где тот город Гомель, Фрумина завод

Там работал мальчик двадцать один год...

Спявак у разарваным сарочцы і брудным бесказырцы, насупутай на самыя вочы, стаяў, прыхіпуўшыся да тэлеграфнага слупа супроць Халоднагорскай турмы. Харкаў ляжаў уніз бясконцым морам дахаў, садоў і комінаў. Даўно нялоены твар спевака паказваў, што ён толькі што выйшаў з брамы турмы.

Гэту песеньку аб гомельскім заводзе Фрумина злачынцы, забойцы, бяспашпартныя спявалі ў Лук'янаўскай турме ў Кіеве, у Орлоўскім цэнтралі.

Бязлітасны эксплаататар Фрумін, які марыў рабочых голадам, не шкадаваў людзей. За кожную дробязь ён выкідаў за вароты. На заводзе ён помнаваў толькі работу і гаратку. Завод Фрумина калечыў людзей, адсюль выходзілі безнадзейныя кадры люмпен-пролетарыята. Але Фрумін сеяў нянавісць — і адсюль выходзілі грозныя кадры рэвалюцыянераў.

З 1890 г. працаваў завод Фрумина. Пасярэдзіне двара ўзвышаўся скрыпучы журавель, але калодца там не было. Журавель замяняў кран для падёмкі адлітых дэталей. Пад лесніцай размяшчаўся мадэльны цэх. Памяшканне былога шышэльнага аддзела рабочыя зараз занялі пад умывальнік. На заводскім дварэ стаяў сарай, у ім у два рады ішлі нары. Тут жылі рабочыя Фрумина. «Бытавымі» ўмовамі Фрумін займаўся таму, што работа на заводзе пачыналася ў 2 гадзіны ночы і канчалася таксама позна ўночы. Калі стомленыя ліцейшчыкі падалі з ног, тады наглядчык будзіў кавалёў і тыя пачыналі каваць жалеза, каб, падаючы ад стомы, перадаць яго слесарам. А наглядчык ужо ганяў заснуўшую змену ліцейшчыкаў. Завод працаваў бесперапынна.

Для таго, каб моцна і непарушна трымалася гэта сістэма, Фрумін купіў наглядчыку Янкелю Дынаву будзільнік. Будзільнік дазваляла Янкелю браць дамоў і ставіць у гаршкох супружага ложка. Але пакольні будзільнік з'яўляўся гаспадарскім капіталам, удзень Янкель абавязан быў прыносіць яго на завод і трымаць у сваёй канторцы. Па гэтаму будзільніку жыў увесь завод.

Аднойчы Янкель прачнуўся, і спіхнулны пот адразу выступіў на яго твары. Ён ужо адчуў, як да тоўстага наглядчыцкага носа прыціскаецца не менш тоўсты Фрумінскі кулак.

Позна ўжо прабіваліся праменні святла. Будзільнік маўчаў. Спазніцца з пачаткам работы на цэлую гадзіну, астудзіць плаўку — Фрумін гэтага не дарае. Янкель ускочыў, схапіў будзільнік і кінуўся на завод. Ён бег па сляпых гомельскіх вуліцах. Горад яшчэ спаў. На рагу Рускінскай глыбокадумна драмаў паліцэйскі. І якраз тады, калі Янкель [illegible] каля паліцэйскага, пракляты будзільнік зазваніў. Паліцэйскі прачнуўся і ўбачыў вар'ята, які без шапкі бег па гарод вуліцы з будзільнікам. Янкеля затрымалі за парушэнне гарадскога спакою. Дарэмна крычаў ён, што завод стаіць, што яму трэба пабудзіць рабочых. І толькі раніцой, калі сам Фрумін уварваўся ў рабочую казарму з закушанымі ад злосці губамі і палкай скідваў з ліцейшчыкаў кажухі, Янкеля Дыдзва вызвалілі з паліцыі. З таго часу яму забаранілі браць будзільнік дамоў.

На работу на завод прымаў старшы майстар Дамброўскі. Ён пенарідаў нурэяў. Хадзіў звычайна ў падкованых чобатах, і крокі яго чуваць былі здалёку. У канторцы майстра вісялі кніжкі сышчыка Шигертона, французскі ключ, некалькі цібулін і пустыя бутылкі з-пад гарэлкі. Кожнае трэцяе слова ў майстра было лаянкай. Аднойчы да Дамброўскага прыйшоў 14-гадовы нурэйскі падростак Фішбейн. Ён прасіўся на работу.

— Жыдзёнак, пашоў вон, — і майстар выгнаў яго з канторы. Тады слесар Брусаванік, якога Фрумін паважаў за залатыя рукі (імі было зроблена нямала золата для кішэняў Фрумина), заступіўся за Фішбейна. Ён прывёў падростка проста ў канторку Фрумина.

— Прымі, гаспадар, мы з яго залатога работніка табе зробім.

Фрумін абвёў вачыма падростка, сплюнуў на падлогу і расцёр нагой. Гэта азначала, што ён у добрым настроі.

— Няхай ідзе ў цэх, — сказаў Фрумін.

Праз дваццаць год гэты падростак

Дырэктар завода тав. ФІШБЕЙН.

стаў дырэктарам завода.

У 1914 г. завод зрабіўся незвычайным. Майстар Дамброўскі стаяў каля праходнай будкі і ветліва вітаўся з рабочымі. Некаторым ён з асаблівай павагай паціскаў рукі. Рабочыя разыходзіліся на варштатах і з агідлівасцю браліся за інструмент. Часта малаткамі адбівалі пальцы, часта садзіліся і курылі дарагія папіросы. Тады майстар падыходзіў ціхенька і чакаў, пакуль яго пачастуюць цудоўным «стамболі». Завод «працаваў на абарону» і сынкі гомельскіх багацеяў хаваліся тут ад насылкі на фронт.

Але як толькі з фронта паваліліся да дому першыя партыі салдат і Мікалай дрыжачай рукой падпісаў адмаўленне ад трону, гэтыя «рабочыя» ў адзін дзень пакінулі завод.

Цэхі апустэлі. Слесар Брусаванік і ліцейшчык Ярумскі прыбівалі над варотамі новую шыльду «Трэці дзяржаўны завод». Пад гэтай шыльдай з франтоў і турмаў сцягваліся былыя рабочыя завода Фрумина. І аднойчы ўначы, абвешаны кулямётнымі істужкамі і бомбамі, на завод прыйшоў камісар асобай дняпроўскай флатыліі Мельнікаў.

— Таварышы, я дэлегат ад чырвоных матросаў...

У ліцейным цэху каля палаючых вагранак быў першы рэвалюцыйны мітынг. Рабочы калектыў трэцяга дзяржаўнага завода ўзяў першае рэвалюцыйнае задание — адрамантаваць дняпроўскую флатылію, каб яна магла тармінова выступіць на беларускі фронт.

***

24 жніўня 1934 г. на вялікім мітынгу, на вялікім заводскім дварэ была зачытана пастанова бюро Гомельскага гаркома КП(б)Б. «За стопроцантнае выкананне плана, за лепшую якасць прадукцыі, за добраарганізаванае спаборніцтва і ўдарніцтва, за лепшую перабудову партыйнай работы, за лепшую пастаноўку тэхнічнай вучобы ўзнагародзіць завод «Пролетарый» пераходным сцягам гарадскога камітэта партыі».

Сцяг стаў да чатырох другіх сцягаў, заваяваных заводам у апошнія гады. Чатыры магутныя карпусы цэхаў высяліся над сцягамі. Новыя машыны — гордасць совецкага варштатабудаўніцтва — бліскалі начышчанымі станінамі ў цэхах. З трыбуны гаварылі ўдарнікі дзень завода. Хутка будзе ўстаноўлены члены чатырохсупартных такарных варштат — цуда тэхнікі. На ўсім заводскім дварэ вакол цэхаў сёпеншія клумбы расквітнеюць і падымуцца высокай сцяной жывых кветак. Заканчваецца абсталяванне вялікага канвеера ў зборачным цэху. Марка завода «Пролетарый» становіцца вядомай на ўсім Саюзе. Завод «Пролетарый» становіцца бліскучым сацыялістычным прадпрыемствам.

2. Інжынеры

Уласна кажучы слова «інжынер» на заводзе не ўжывалася ніколі. Сам Фрумін часамі ўжываў яго, але не ў сэнсе спецыяльнасці, а ў сэнсе высокага тытула, які раўняўся, прыкладна, тытулу начальніка палатовай паліцыі.

Буйнейшым спецыялістам на заводзе лічыўся Васіль Кароўня. У дні загрузкі вагранак спецыяльны наглядчык з чорнарабочых сачыў, каб Кароўня не піў. Напружваючы ўсе свае сілы, Кароўня трымаўся цэлы дзень. Ад непрывычнай цярозасці ў яго кружылася галава. Ён даваў тэхнічныя парады, як трэба рабіць шыхту. Па сакрэту, моцна выпіўшы, Кароўня прызнаваўся сваім вучням, што сам ён у ліцейнай справе нічога не разумее.

Калі рамантавалі флатылію, мадэльшчык і слесар Уладзімір Васільевіч Ярумскі разабраў шасцідзюймовую гармату і пачаў выкідваць за борт дэталі, якія, на яго думку, амартызаваліся.

— А што ты паставіш на іх месца? — спытаў старшы камендар.

— Зраблю сам!

Камендар смяяўся. Ніколі не бачыўшы гармат, нічога не разумеючы ў механіцы стрэлу, і траекторыях палёту снаряду, не будучы нават арудзійным тэхнікам, не ведаючы трыканометрыі, смешна было брацца за такую работу.

Ярумскі разазлаваўся:

— Ты марская душа, у мае справы не лезь. Я слесар, зраблю табе — і страляй у паляка, а сам маўчы, траекторыя вадзяная.

Ярумскі адрамантаваў гармату. Водгукаў аб яго рабоце польскія легіянеры не змаглі даць. Ім назрывала галовы пад Кіевам. З таго часу Ярумскага звалі «арудзійным тэхнікам». Гэта быў другі спецыяліст завода.

Да 1925 года на заводзе «Пролетарый» не было ніводнага інжынера са спецыяльнай адукацыяй. Калі Наркамцяжпрам перавёў завод на серыйную вытворчасць, ён абяцаў прысласць інжынераў. Майстры цэхаў абурыліся: ніякіх інжынераў нам не трэба. Але ў штатах завода ўжо быў малады совецкі інжынер Пірагоў.

Інжынер гэты нічым не адрозніваўся ад рабочых. Ён жыў быў у цэхах, браўся за любую работу.

І вось раптам на завод прыбыў прыжыны варштат. Ён прыбыў пасля маланкі Наркамцяжпрама. Трэба было заўтра-ж апрацаваць на ім партыю мотапомпаў і адгрузіць. Гэта азначала, што ўночы варштат павінен быць пушчан. Ніхто не ведаў, як да яго прыступіцца. Тады выйшаў наперад нейкі малады чалавек і сказаў, што ён пусціць варштат. Малады чалавек узяў «кавальскую бабу», скамандаваў яе як фундамент сам зрабіў праводку, сам сабраў усе часткі, сам стаў працаваць на варштаце. Так увесь завод даведаўся пра інжынера Пірагова.

Пасля пабудовы газагенератара на шклозаводзе «Гусь-хрустальны», манцёры нямецкай фірмы Афаў-Ге спалілі ўсе праекты, чарцяжы і разлілі. Яны паехалі ў надзеі, што боль шэвікі зломаць галаву, але большэвікі не толькі не зламалі галаву, а пачалі будаваць у Гомелі яшчэ большую газагенератарную станцыю. І тэхналагічны працэс выпуску 44 аб'ектаў для яе распрацаваў малады інжынер на заводзе «Пролетарый». Калі да заканчэння пасадкі скруберу аставалася толькі пяць дзён, а трэба было зрабіць яшчэ палову работы, гэты інжынер ператварыўся ў нейкі акумулятар энергіі. Ён вёў 40 чалавек на штурм і за пяць дзён па яго графіку яны зрабілі тое, што пяць дзён назад кожны з іх лічыў немагчымым. Так увесь завод даведаўся пра інжынера **Шапіра**.

Калі рабілі запасныя часткі для трактароў, людзі літаральна губілі спакой над цыліндрамі. Ні адзін гомельскі завод не мог выпускаць цыліндраў. На тонкіх сценках абвязкова аказваліся раковіны, а гэта быў брак. Цыліндры згубілі многа аўтарытэту. Так было, пакуль адзін інжынер не адкрыў новы метад адліўкі без раковін. Інжынер арганізаваў штурм прарыву па запасных частках, і «Пролетарый» першы тэлеграфна рапартаваў ЦК аб выкананні плана. Так увесь завод даведаўся пра інжынера **Берачэню**.

На заводзе зараз працуе 12 тэхнічных гурткоў. Усе комсамольцы завода «выдатнікі». Гомельская прамысловасць вучыцца ў «пролетарцаў», як трэба арганізоўваць тэхнічную вучобу. «Пролетарцы» мяркуюць ператварыць завод у завод-ВТНУ. Дзесяць інжынераў, атрымалі дыпломы, працуючы на заводзе. Святам заводскай секцыі ІТР быў дзень, калі слесар Ваўчок, не адрываючыся ад вытворчасці, скончыў машынабудаўнічы інстытут.

Завод стаў адным з факультэтаў па выпуску інжынераў сацыялізма. Атрымаўшы ў ім дыплом большэвіцкай загартаванасці, выйшлі новыя людзі. Токар Ісак Ды нер стаў дырэктарам Яраслаўскага электразавода, токар Ліберман — начальнікам аддзела галоўнага кіраўніцтва грамадзянскага паветранага флота, токар Любаміркі — начальнікам паліграддзела Ханёрской МТС, токар Фішбейн — намеснікам рэдактара газеты «Рабочы». Слесар Касавы стаў інжынерам авіяцыйнага завода. Слесар Лянман паступіў на дызельны факультэт Баўманскага інстытута. Ліцейшчык Зельманаў рэдагуе газету ў Полацку. Фрэзероўшчыкі Катунін, Вігдорчык і Рубін лятаюць на чырвоных знічальніках. Токар Гаралік — інструктар гомельскага гаркома партыі. Токар Казлоў — камісар у войсках Камісарыята Унутраных Спраў. Слесар Герман кіруе культсектарам ГСПС. Гэты спіс не мае канца.

Фрумін звычайна сцвярджаў: мае рабочыя любяць мой завод; паправаўшы некалькі год, чалавек не можа не палюбіць завод.

Гэта была палітыка захавання старых кваліфікаваных кадраў. Да некаторай ступені Фрумін быў

Стары рабочы тав. БРУСАВАНІК

3. Кадравікі

праў. Перанёсшы на працягу некалькіх год увесь жах работы на фрумінскім заводзе, чалавек уступаў у такое становішча, калі яму было ўсё роўна, што далей — смерць, гарэлка, праца, ці сон. Але словы «любоў да завода» гучалі дзіва нават для самога Фрумина.

Няўжо любіў завод стары токар Дынаў, калі ён аднойчы заснуў у качагарцы, і трубы, што падаюць ваду у кацёл, замерзлі. Не з любві, а з жаху ён кінуўся разаграваць іх, агальваў пальцы і паклаў на агонь уласную шапку. За разаграванне яго застаў майстар Дамброўскі і ўдарыў абломкам жалезнай трубы па спіне. Стары Дынаў памёр у качагарцы, сплёўваючы кроў. Ён не ў імя любві да завода.

Але быў дзіўны час, калі нанавісць раптам змянілася любоўю. Тады комуніст Фішбейн, былы ў групе герояў у асаджаным «Савоі», са слязьмі на вачах прасіў артылерыста браць вышэй, каб не попадаць у раён завода — на гэтым заводзе загінула юнацтва Фішбейна. Быў дзіўны час, калі прапрацаваўшы 10 год на заводзе слесар Кабанчікаў у 1919 годзе, калі сям'я яго мёрла без дроў у хаўціцы з нарыбіваючымі шыбамі, сняў дошкі свайго плота і пашоў рамантаваць дах разбітага завода. Кабанчікава ніхто не прасіў аб гэтым. Гэта быў той час, калі рабочыя на плячах насілі дровы ў качагарку завода, калі адрамантаваная імі Дняпроўская флатылія граміла белапалякаў. Тады слесар Брусаванік, які ні разу ў жыцці не змог накарміць дасыта сваіх 11 дзяцей, раптам выступіў супроць пабудовы малога корпуса ліцейнай.

— Што, мы не зможам вялікі пабудаваць?

Прарабам і загадчыкам снабжэння гэтай пабудовы ў 1924 годзе быў малаграматны слесар Брусаванік. Такога строгага гаспадара, які лаяў каменшчыкаў за кожны аблом мак цэглы, завод бачыў упершыню. І ў пачатку пэна, калі Фрумину на момант здалося, што мінулае яшчэ вернецца, ён напісаў у Совнархоз пісьмо: «Я мог бы взять завод в концессию, я мог бы сделать из него настоящий завод, так чтобы советской власти от него была только польза. Но я прошу вас убрать с завода Фішбейна, Аграната, Вапнярского и еще бездельников, согласно моего списка. От этих хозяйству завода может быть большой вред».

Класавае пачуццё не ашукала Фрумина. Ён правільна ўгадаў будучых гаспадароў — дырэктара і начальнікаў цэхаў, і правільна баяўся іх.

У ноч на 25 снежня 1933 года начальнікі цэхаў спаткаліся ў зборным цэху. Усе яны ішлі сюды, шукаючы адказу на пытанне — справімся ці не. Мэрудна падкваталіся вагнеткі з бліскучымі мотапомпамі «Вертынгтон». Стомленыя, другія суткі не спаўшыя, людзі падхватвалі іх. Глуха звінела жалеза ў кацельнай. За вялікімі вокнамі цэха ледзь-ледзь насўвалася зімняе світанне. Нежкімі зводкамі ў кішэнях начальнікаў цэхаў ляжала невыкананая праграма. У варткоме стаяў сцяг ЦК партыі, і зараз кожны думаў аб ім. Ці справімся? Няўжо завод імя Ланцуцкага перагоніць нас?

— А памятаеце, таварышы, пекалі Фрумін гаварыў, што не справімся. А вось які, завод пабудавалі.

Так прайшла ноч. Назаўтра сцяг быў адлан заводу імя Ланцуцкага. Але праз квартал завод «Пролетарый» набыў некалькі сцягаў і зноў заваяваў імя лепшага завода Гомеля. Фішбейн — дырэктар завода — заслужана сцвярджаў: рабочыя любяць свой завод; стварыцьны з ёсіх такі завод, нельга не любіць яго.

У кватэры слесара Брусаваніка звычайна праходзяць палітзаняткі. За сталом сядзяць дырэктар, начальнікі цэхаў, старыя ліцейшчыкі, токары слесары. Пасля заняткаў п'юць чай і ўспамінаюць. Брусаванік расказвае: у яго дачка — інжынер завода «Чырвоны хімік»; сын — інжынер-будаўнік у Маскве, сын — студэнт, сын — інжынер у Ленінградзе, трое сыноў, — дактары, сын — старшыня калгаса, сын — рабочы завода. Брусаванік расказвае: майстар цэха некалі біў яго і прымушаў знімаць шапку.

Каваль Бобылеў на вечары кадра вікоў завода скромна прызнаўся:

— Люблю сваю работу. Вельмі люблю завод. Здаецца і дня без яго не пражыў-бы.

Гэтыя простыя словы выклікалі буру воплескаў. Кадравікі гаварылі аб заводзе, як аб сваім родным і блізкім. Ніколі не давялося пачуць такіх слоў Фруміну. І калі-б хто-небудзь захацеў вярнуць завод Фруміну, яму перагрызлі-б горла. Магутная пытальлю краіны будзе завод «Пролетарый».

4. Машыны

На выдатным шляху завод «Пролетарый», праз усе фазы яго сацыялістычнага развіцця, астаўся гістарычны шлях машыны. Розам з жыццём, у тон кожнай эпосе «Пролетарый» змяняў твар машыны.

Фрумін быў дробны і мізэрны, як мізэрны быў яго чай. Пад сілу Фруміну былі толькі медныя кранікі, ухваты і іншыя атрыбуты дарэвалюцыйнага гомельскага быту.

Гады разрухі ператварылі металургічны завод у шпіталь машын. Завод «Пролетарый» лячыў ранеяную прамысловасць Гомельшчыны. Тут адліваліся новыя часткі для зламаных кліншоўскіх ткацкіх машын. Тут рамантаваці разбітыя апарадамі каты Суражскай паперовай фабрыкі. Тут скрэплялі абтарэлыя шэль-машыны новазыбкаўскай запалкавай. Тут адліваўся, вялікі вал для рачыцкай турбіны. З усёй губерніі сюды зносілі пашкоджаныя жняркі і веялкі, разбітыя вельмі энергічнай рэвалюцыяй.

Але ўжо ў 1926 годзе ў Ленінградскі порт прыбыў першы ангельскі валамер, як тэхнічны ўзор. Маладая, рэспубліка аслабнілася ад эканамічнай залежнасці. Ярумскі наглядзеў на ангельскую машыну і сказаў: «зробім». Нялёгка гэта было сказаць, калі на заводзе не было ні растачных, ні карусельных варштатаў, ні Дніпраў. Цыліндры растачвалі ручнымі прыстасаваннямі. Над кожнай дэталлю думалі дні мі.

З першых дзён нынішняй завод пачаў будаваць краіну. У гэтыя дні растворамяшалка была цэнтральнай машынай эпохі. Яе імя называлі часцей за ўсё. На ўсёй краіне тады драбілі камяні і замешвалі бетон для фундамента сацыялізма. Друк сачыў за спаборніцтвам бетоншчыкаў Днепрабуда і ХТЗ. На левым беразе Дняпра паставілі сусветны рэкорд бетонаваму саў, потым яго пабілі ў Харкаве, потым перакрылі на ЧТЗ. Гэтыя рэкорды былі пастаўлены на растворамяшалках гомельскага завода «Пролетарый».

У 1932 годзе дырэктара завода выклікаў т. Орджанікідзе. Наркамцяжпром прапанаваў перайсці на серыйную вытворчасць мотапомпаў «Вертынгтон». Ведаюць, што гэта машына патрэбна ўсім калгасным установам — сказалі ў калегіі наркамата. — «Вертынгтон» — асноўны агрэгат нафтаадбымчы і здабычы золата. Вам давяраецца справа вялікай важнасці.

2.600 штук мотапомпаў выпусціў завод толькі за 1934 год. Задание наркома было выканана.

Завод «Пролетарый» стаў тэхнічна пераўзбройваць прамысловасць. Шостая машына на фабрыцы «Серпа і Молата», якая дае вышэйшую хуткасць папяровай істужкі, атрымалі рольныя агрэгаты ад «пролетарцаў». Газагенератарная станцыя сістэмы «Афаў-Г» атрымала скруберныя ўстаноўкі на заводзе «Пролетарый». Гэту-ж марку відаць на плітах новых прэсаў фанернага завода «Везувій». Галоўны канвеер ЦЭЦ камбіната імя Гікало зроблен рабочымі завода «Пролетарый». І ўрэшце, на ўстаноўленай на марганцовым заводзе пяцідэгатнай ночы «Пінча», цана якой па англійскаму прэйскуранту 32.000 руб. золатам, а канструкцыя лічыцца шедэўрам еўрапейскай тэхнікі, выбіты літары: «СССР, завод «Пролетарый». Гомель».

XVII з'езд партыі прыняў рашэнне ўсямерна фарсіраваць буйнае варштатабудаўніцтва. Зноў тав. Орджанікідзе выклікаў дырэктара завода.

І перад дырэктарам паклалі на лісце паперы, які, як у люстры, адбіваў увесь пакой, чарцёж дзіўнай машыны.

— Гэта валазапрацоўваючы варштат Калава. Адзін такі варштат ёсць на шарыканадшыпніковым заводзе імя Кагановіча. Ці зможаце вы зрабіць другі?

На першамайскай дэманстрацыі гэтага года калона «пролетарцаў» вынесла макет самай цудоўнай і самай складанай машыны, якую ба чыў калі-небудзь Гомель. Эксперыментальны экземпляр валазапрацоўваючага варштата Калава ўжо стаіць у зборачным цэху. Гэта быў вянок трыумфальнага шляху машыны.

5. Парткалектыў

Завод, людзі, кадравікі, інжынеры, машыны — усё гэта зліваецца ў адно ў стройнай сістэме сакратара парткома **Брандзіна**. І імённа гэта сістэма харчуе бурны рост кожнай галіны. Сістэма Брандзіна вельмі простая. Трэба ўзяць кароткі ясны лозунг, у якім увасобіць усю сутнасць палітыкі партыі, давесці гэты лозунг да свядомасці мас і, прымяняючы яго, як магутны вагар, падпяць ім усё адразу — прамфінплан, культуру, тэхніку, кадры, быт.

Такім лозунгам з'яўляецца сталінская думка аб шасці вялікіх умовах. Яе Брандзін выводзіць у заваёвах ударнікі, які выконае план — перадавы актыўны культурны чалавек, будзе шчаслівае жыццё для сябе ў шчаслівай краіне. І такога ўдарніка трэба тыхоўваць, аб такім ударніку трэба клапаціцца.

Калі работніца Блюмкіна была вельмі маўклівай на рабоце, Брандзін прыйшоў да яе дамоў. Ён разведаў усе дробязі яе сямейнага быту. Аказалася, што ў яе хворая сям'я, і гэта прымушала Блюмкіну перажываць. Парткам паклапаціўся аб сям'і і атрымаў у асобе Блюмкіну новага актыўнага абаронцу лініі парткома.

Стары рабочы Копцылеў пасхаў у Крым і ў яго захварэла жонка і дзіця. Суседзі хацелі выкінуць Копцылева, але Брандзін паслаў на дом медычную сястру, якая ўвесь дзень ляжала за сям'ёй, работніцы-комуністкі дапамагалі ў хаце, кожны дзень там бывалі члены парткома. Уся вуліца бачыла клопаты парткома аб рабочым. І калі Копцылеў вярнуўся, усе суседзі расказалі яму. Стары фармаўшчык прыйшоў у партком са слязамі на вачах: «Дзякую, тав. Брандзін. Дай мне такую справу, каб самая цяжкая была. Я выкапаю».

Сакратар парткома тав. БРАНДЗІН.

Кожны дзень, кожную гадзіну Брандзін працуе з сваімі парторгамі, і калі трэба было дабіцца ліквідацыі браку на трактарных дэталях, Брандзін з радасцю адзначыў, што парторг ліцейнага цэха Смірноў мабілізаваў на дапамогу матаў і жонак рабочых, знайшоў такую мову для кожнага рабочага, што фармаўшчыкі прыходзілі ўначы з работы да яго на кватэру — падаюцца радасныя весткі: сёння фармоўка найлепш лепш.

Парткам біўся за стварэнне атмасферы пашаны да кадравіка, спецыяліста, ударніка. Совет кадравікоў — гэта кансіліум лепшых розумаў загода. І без іх парады нічога не прадпрымае дырэктар. Калі нарыкамат або трэст даюць заводу задание, першым яго разглядае совет кадравікоў. І толькі пасля абмеркавання гэтага рашэння заводы забяспечаны.

Стары слесар **Абрам Паўлоцкі**, лепшы спецыяліст завода, мастак верстака, звычайна ні з кім не гаварыў ні слова і нікога не прызнаваў. Але калі ён заўважыў, што яго думкай прыходзяць, што яго слова цэняць і паважаюць, што яму аддаюцца ўсе перавагі, ён сказаў: «мы з вамі, старычкі,—міністэры, а міністэраў народ спытае; трэба, старычкі, старацца». У выніку імкнаванняў «міністэраў» быў зроблен варштат Калава.

Парткам змог даць пожаму з рабочых адчуць клопаты партыі аб ім, вялікую сілу і мудрасць партыі. І не дарма, вярнуўшыся з Масквы, стары майстар Аграпат, хвалюючыся, сказаў у цэху:

— Я мэў, таварышы, вялікае шчасце ў жыцці, я бачыў Сталіна. І ад гэтага хвалявання ў маім серцы і вялікая ахвота да работы.

Вобраз правадыра партыі вялікаў мацнейшае натхненне ў старога майстра. Уласнымі рукамі Аграпат зрабіў два парадныя цыліндры для мотадомпаў у гонар таварыша Сталіна. І гэтыя два цыліндры пасляжылі пачаткам для здымання фонда імя Сталіна да XVII з'езда партыі на 15.000 рублёў зэкіх плата. І не дзіва, што ў такой атмасферы токар Герошін, які 25 гоя працаваў на заводзе, калі нядоечы, напіўшыся, не выйшаў на работу, пасля гутаркі з парторгам піша цудоўнае адмаўленне: «Так как я сделал преступление, и чтобы никто из молодых на меня не смотрел, то я от пьянства отрекаюсь и буду работать ударником и никому пить не советую».

Парткам звярнуў увагу, што майстар Жароўня вельмі хутка абучыў сваіх падручных. Парткам зацікавіўся метадам. Тады майстар Жароўня тэхнічную вучобу зрабіў метай свайго жыцця і дабіўся таго, што з другіх металазаводаў да яго сталі прыязджаць вучыцца метадам выкладання. Гэта не дзіва. Брандзін ведаў, як выклікаць энтузіязм. Не дзіва і тое, што рабочы Школьнікаў прыходзіць у ЗРК прасіць шафу для кніжак, якія на стале ўжо не змяшчаюцца. Парткалектыў знайшоў самы верны шлях да перамог.

6. Пакаленне

Будучае завода «Пролетарый» цудоўнае. Будучае—гэта тыя, хто не бачыў Фруміна, хто не памятае сараяў і дымнай ліцейнай, хто зі разу не бегаў за поўбутылкай для майстра Дамброўскага.

На заводзе вырас 23-гадовы брыгадзір сквазной брыгады растворамяшалак **Мішка Касовы**. Ён заваяваў для брыгады ордэн Працоўнага чырвонага сцяга. Пяць дзяўчат комсамольская брыгады **Аргаваў** у халодную зіму, калі вада замярзала ў трубах выпрабавальнай станцыі і пальцы не хацелі слухацца, сабралі першую партыю мотапомпаў «Вертынгтон». Яны першыя рапартавалі аб асваенні новай машыны.

У сямейным альбоме старога фармаўшчыка **Васільева**, сярод патрыярхальных здымкаў павет у фэце і сямейства на чале з бародатым дзедам, хаваецца рэдкі здымак. Васільеў бераже яго больш за ўсё. На гэтым здымку ён сядзіць на чыгунным абрубку на дварэ ліцейнай і вакол яго шэсць маладых хлопцоў з непакорнымі валасамі і весёлымі тварамі. Гэта вучні Васільева, яго школа першакласных фармаўшчыкоў.

Токар Ісак Грынблат, прыйшоўшы на завод у першы дзень, укроў у майстра Гарадзецкага 10 рублёў. Майстар Гарадзецкі лічыўся лепшым токарам завода. Зараз лепшым токарам завода лічыцца Грынблат.

Адзін з такіх энергічных хлапцоў —Шульклепер—здаваў у комсамольцы завода імя Ланцуцкага пераходны сцяг гаркома комсамола.

Комсамольская арганізацыя завода «Пролетарый» выхавала дзесяткі адольнейшых маладых людзей.

Нядарма комсамольцы завода атрымалі грамату ЦК ВЛКСМ. У іх лепшыя ў Гомелі тэхнічныя гурткі. Яны лепшыя ў горадзе варашылаўскіх стралкі, у іх лепшая ў горадзе валейбольная каманда, у іх вельмі весела і радасна.

Іра заслужанай артыстка рэспублікі Бабанавай вельмі падабаецца комсамольцам завода. Аб ёй гаварылі многа. У клубе пучацца, пяваюць на турніку і спяваюць хлапцы. Заходзячы ў клуб, сакратар комсамольскага калектыва Зельманаў часта дэкламуе з п'есы «Личная жизнь», якая падабаецца яму больш за ўсё.

— Берегитесь, друзья! Нищета философии —

Это самая страшная нищета.

Б. ПАСКАНЬЕЎ, С. РУБЕЖЫН.



Помпы Вертынгтона выробленыя заводам «Пролетарый».

ПАДРАБЯЗНАСЦІ ГЕРАІЧНАЙ БАРАЦЬБЫ ІСПАНСКІХ РАБОЧЫХ

ПАРЫЖ. 26 кастрычніка. (БЕЛТА). Іспанскае ваеннае міністэрства паведамляе, што «канцэнтрацыю войск у Астурыі можна лічыць закончанай». Гэта паведамленне сведчыць, што ў Астурыйскім раёне захаваліся яшчэ значныя рэвалюцыйныя сілы і праістаяць новыя баі.

Падрабязнасці падзей у Овіедо, Мадрыдзе і іншых месцах Іспаніі, паведамляемыя буржуазным друкам, сведчаць аб выключным гераізме, з якім біліся рэвалюцыйныя атрады. Так, паведамляюць аб актыўным удзеле жанчын у баях. У Мадрыдзе знойдзена некалькі трупаў дзяўчат, якія біліся да апошняга моманту і загінулі каля сваіх кулямётаў.

Буржуазная французская газета **«Эр нувель»** піша: «Уладавыя сілы не пагнушаліся скарыстаць усе свае сучасныя вайны — танкі, авіяцыю, цяжкую артылерыю, афрыканскія батальёны і газ. Колькасць забітых перавысіла ўсе дапушчэнні. Іспанскі парламент, які павінен быў сабрацца і да гэтага часу не сабраўся, існуе толькі фармальна. Частка дэпутатаў арыштавана, частка выратавалася ўцёкамі і знаходзіцца ў эміграцыі. Зараз складаюць тых, хто аказаўся на другі бок барыкад: г. зн. прыхільнікаў урада».

«Рэпюблік» называе Леруса іспанскім Тіерам. Сёмпюрня **«Юманітэ»** піша аб здрадзе анархістскіх правадыроў. Газета ўказвае, што ў той час, як рабочыя-анархісты і сіндыкалісты біліся разам з комуністамі і сацыялістамі, рад вядомых правадыроў сіндыкалістаў і анархістаў заявіў аб тым, што гэты рух іх ніколькі не цікавіць.

АНГЛІЯ БАЛАНСІРУЕ ПАМІЖ ЯПОНІЯЙ І ЗША

ЛОНДАН 26 кастрычніка (Інфармацыя «Правды»). Сёння раніцою [illegible] сумеснае пасяджэнне англійскай і японскай делегацый, якія новым [illegible] удзел у марскіх перагаворах. Услед за пасяджэннем была склікана нарада англійскіх і японскіх марскіх экспертаў. Брэст перагаворам захоўваецца ў абсалютным сакрэце. Прасачыўшыяся ў журналістыкі колы весткі паказваюць, што Японія, несумненна, працяжае настойваць на сваіх патрабаваннях: роўнасць [illegible] тонажу японскага флота з флотам Англіі і Амерыкі і поўная свабода будаваць буйныя караблі ў межах агульнай нормы без абмежавання па катэгорыях.

Англія праводзіць палітыку балансіравання паміж Японіяй і Амерыкай. Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, Норман Дэвіс (ЗША), які гутарыў учора з Макдональдам, даведаўся з ім аб тым, што перагаворы трэба пасунуць, а ў Японіі заяўляць удакладнення яе прапаноў.

Гэта рашэнне Макдональда і Дэвіса разглядаецца як некаторы крок да англа-амерыканскага супрацоўніцтва ў перагаворах аб марскіх узбраеннях.

26 кастрычніка адбудзецца сумеснае пасяджэнне англійскай і амерыканскай делегацый.

Вынікі засухі у ПША



Засуха выклікала ў радзе штатаў ПША масавы падзеж жывёлы і зруйнаванне фермераў. НА ЗДЫМКУ: грузавік вывозіць з поля загінуўшую жывёлу.

ДЭМАНСТРАЦЫЯ ПОЛЬСКА-ГЕРМАНСКАГА ЗБЛІЖЭННЯ

ПАРЫЖ. 26 кастрычніка (Інфармацыя «Правды»). Германскі і польскі ўрады ўзаемна ўвялі з 1-га лістапада свае прадстаўніцтвы ў Варшаве і ў Берліне ў ранг пасольстваў.

Па гэтаму поваду Пертынакс выступае ў **«Эко дэ парыж»** з артыкулам пад заглоўкам «Польшча—Германія—Венгрыя», у якім піша:

«Германія і Польшча фашылі ўзаемна пратаварыць свае дыпламатычныя прадстаўніцтвы ў пасольствы. Сімвалічны жэст, які азначае, што франка-польскі саюз 1921 года больш ужо не з'яўляецца асноўным стыжнем знешняй палітыкі варшаўскага ўрада!

Да гэтага часу адна толькі Францыя была прадстаўлена на Вісле паслом. Мы доўга не рашаліся ацаніць па вартасці палкоўніка **Бека** і яго дыпламатыю.

Але «мемарандум польскага ўрада ад 27 верасня па пытанню аб пакце ўзаемаданамогі прымусіў нас змяніць свой пункт гледжання. З гэтага часу, пакуль не будзе даказана адваротнае, мы павінны разглядаць Польшчу, як фактычную саюзніцу нацыянал-сацыялістскай Германіі.

Паездка Гембеша ў Варшаву дала нам магчымасць заключыць, што польскі ўрад дагаварыўся не толькі з пан-германістамі, але і з тым смелым аванпостам пан-германізма, які называецца Венгрыяй. Аказнасць Венгрыі за вяроўку і надрыхтоўку банд, зрабіўшых марсельскае злачынства, відавочна. Пажоўнік Гембеш, які ўжо многа год назад у самым Заграбе прысутнічаў пры зараджэнні харвацкага тэрарызма, быў прынят у Варшаве прыяцелямі, адданымі агульнай справе».

Кангрэс французскіх радыкал-сацыялістаў

НАНТ, 26 кастрычніка. (БЕЛТА). Пасяджэнні адкрытага ўчора кангрэса радыкал-сацыялістскай партыі (партыя французскай дробнай буржуазіі) пачаліся дакладам **Корнію** аб дзяржаўнай рэформе. З самага-ж пачатку высветліліся рэзка адмоўныя адносіны кангрэса да прапанаванага Думергам (прэм'ер Францыі) праекта перагляду канстытуцыі і да фашысцкіх арганізацый.

Дакладчык Корню катэгарычна выказаўся супроць патрабавання Думерга аб прадстаўленні главе ўрада права роспуску палаты без згоды сената, супроць прадстаўлення ўраду права продаўжання ў дэкрэтным парадку бюджэта бягучага года на будучы год.

Ён выказаўся супроць унясення ў канстытуцыю пункта аб абмежаванні грамадзянскіх праў дзяржаўных служачых (права стачак, дэманстрацый і т. д.), лічачы, што гэтыя пытанні можна вырашыць нармальным заканадаўчым шляхам. Корню высунуў свой план рэформы, які зводзіцца ў асноўным к змяненню рэгламента палаты, працедуры абмеркавання законаў і т. п. без змянення самой канстытуцыі. Корню заявіў, што ўрад прымае рашэнні пад націскам фашысцкай вулицы і што пасля 6 лютага парламент фактычна не існуе. Корню выказаўся за роспуск пагражаючых рэспубліцы ўзброеных ліг.

Тав. СУРЫЦ УРУЧЫЎ ВЕРЫЦЕЛЬНЫЯ ГРАМАТЫ

БЕРЛІН, 26 кастрычніка. (БЕЛТА). Сёння новы паўпрэд СССР у Германіі тав. **Сурыц** быў прынят рэйхсканцлерам **Гітлерам**, якому ўручыў свае верыцельныя граматы. Пры гэтым т. Сурыц і рэйхсканцлер [illegible] абменяліся прамовамі.

Следам за гэтым т. Сурыц прадставіў рэйхсканцлеру членаў совецкага паўпамоцнага прадстаўніцтва. Пасля вручэння верыцельных грамат паміж рэйхсканцлерам Гітлерам і т. Сурыцам адбылася кароткая гутарка.

Пры прыёме прысутнічалі германскі міністр замежных спраў Нейрат, статс-сакратар Мейснер і статс-сакратар Бюлаў.

УСЕБЕЛАРУСКІ РЭЙД ГАТОЎНАСЦІ ДА ЗІМЫ

Завод „Большэвік"

Пасля апублікавання дырэктывы ЦСПСБ, ПК ЛКСМБ і «Звязды» на заводзе разгарнулася масавая праверка гатоўнасці да зімы. Рабкоры, разам з удзельнікамі груп «лёгкай кавалерыі» і брыгад масавага рабочага кантролю, прымацаваны да жакталў.

У жакце № 55 зроблен капітальны рамонт трох рабочых кватэр. Рамантуецца чацвертая. Астаецца неадрамантаванай пакуль адна кватэра. Да жакта прымацаваны тт. **Лямберг і Школьнік.** Актыўна ўключылася комсамольская арганізацыя.

МІНКІН.

Завод імя Варашылава

На заводзе створана 5 брыгад. У кожнай брыгадзе — ад 5 да 7 чалавек. Брыгады атрымалі пэўныя заданні. Напрыклад, адна брыгада правярае рамонт кватэр, другая — рамонт сталовых, трэцяя — ЗРК і т. д.

Уся работа праходзіць сіламі брыгад масавага рабочага кантролю. Комсамольскі камітэт і заводская газета яшчэ не ўключыліся ва ўсебеларускі рэйд-праверку.

БАРАНОЎСКІ.

Фабрыка „Комунарка"

Фабрычная газета арганізавала пятыры рабкораўскія брыгады, якія прыступілі да абследвання рабочых кватэр. Профсаюзныя арганізацыі і комсамольскі камітэт да гэтага часу не ўключыліся ў масавую праверку і не абгаварылі нават дырэктывы ЦСПСБ, ЦК ЛКСМБ і «Звязды» ў сваёй арганізацыі.

МАЛЫ.

* Менская швейная фабрыка **«Окцябр»** на пабудову мітзвяна самалётаў імя III з'езда рабселькораў сабрала 323 руб. 90 кап. і выклікае на соцспаборніцтва завод «Большэвік». **ПАДОЛЬСКАЯ.**

* У Мазыры на пабудову агітзвяна сабрана 337 руб. Падпіска прадаўжаецца.

«КАЛГАСНІК МАЗЫРШЧЫНЫ».

* Калектыў рабочых і служачых дзяржынскай раённай газеты **«Ударнік і штурмавіч Дзяржыншчыны»** прыняў выклік калектыва работнікаў газеты «Орка» і ўносіць на пабудову агітзвяна 90 руб. 65 к. Выклікаем наследваць нашаму прыкладу работнікаў заслаўскай раённай газеты. **Л. КАРАБО.**

* Рабочыя **Аршанскай** МТМ уносяць на пабудову агітзвяна 135 руб. і выклікаюць наследваць іх прыкладу рабочых Рагачоўскай МТМ.

Старшыня рабачкома АСТРАМЕЦКІ.

***

Сродкі на пабудову агітзвяна трэба перапічваць у Беларускае аддзяленне Дзяржбанка на бягучы рахунак № 160/10006.

АБ МЕРАХ ПА СВОЕЧАСОВАМУ СПАГНАННЮ ПЛАЦЯЖОЎ

ПАСТАНОВА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА І СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР.

У мэтах правільнага і своечасовага ажыццяўлення пастаноў урада па абкладанню 20 проц. даходаў ад заработкаў на тарфяных і лясных распрацоўках, згодна пастановы ЦВК і СНК Саюза ад 7 верасня, і аднаразовага падатку на аднаасобнікаў, згодна пастановы ЦВК і СНК Саюза ССР ад 25 верасня; запішчэння цяганіны і своечасовага спагнання плацяжоў, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Совет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

1. Аставіць канчатковае вырашэнне скарг у адпаведнасці з заканадаўствам за райвыканкомамі і Менскім, Віцебскім і Гомельскім горсоветамі па аднаразоваму падатку на аднаасобныя гаспадаркі і па абкладанню 20 проц. даходаў ад заработкаў на тарфяных і лясных распрацоўках.

2. Абавязаць райвыканкомы, Менскі, Гомельскі і Віцебскі горсоветы пад адказнасць старшынь арганізаваць хуткае і правільнае вырашэнне ўсіх скарг, падаваемых працоўнымі аднаасобнікамі па аднаразоваму падатку і па 20 проц. абкладанню заработкаў ад тарфяных і лясных распрацовак з тым, каб былі забяспечаны вырашэннем усе справы не пазней 1 лістапада 1934 года.

3. Даручыць пракуратуры рэспублікі прасачыць за правільным і хуткім вырашэннем скарг працоўных аднаасобнікаў у адпаведнасці з гэтай пастановай.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

Нам. старшыні Совета Народных Камісараў БССР СААК'ЯН.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР М. ЛЯЎКОЎ.

22 кастрычніка 1934 г.
г. Менск.

КАЛГАСНІКУ ЖЫГАЛОВУ 96 ГОД

КРЫЧАЎ. (Ад карэспандэнта «Звязды»).

У калгасе **«Колас»**, Міхееўскага сельсовета, жыве калгаснік **Жыгалоў Сцяпан.** Яму 96 год. Дзед добра памятае папшчыну. За гэты год Жыгалоў выпрацаваў 250 працадзён.

Старшаму сыну Жыгалова 76 год. Старшаму ўнуку больш 40 год і старшай праўнучцы 22 гады.

ВІШНЕЎСКІ.

ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЯ У УШАЧАХ

УШАЧЫ. (Ад карэспандэнта «Звязды»).

Ва Ушачах пры дапамозе шэфа—рабочых Іжорскага завода абсталявана новая электрастанцыя. Шэф падараваў раёну рухавік і дынама. З 20 кастрычніка электрастанцыя пачала работу. Мястэчка ўпершыню атрымала электрычнае святло.

НЕЙДЛІН.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ПАРТКАЛЕГІІ КПК ПА БЕЛАРУСІ

Партколегія КПК па Беларусі паведамляе, што 2, 3 і 4 лістапада ў 10 гадзін раніцы ў г. Оршы (памяшканне райкома) будуць разглядацца партканфліктаў ПК партсправы наступных таварышоў:

2-га лістапада.

Лук'янава Я. Ул., Волкава А. З., Эстрына І. Ю., Саёнак Ф. Ф., Рэйса Х. М., Вольскай Е., Кіракова В. І., Красуля А. Я. (Быхаўскі раён); Малаткова І. Ф., Балаханава І. З., Кузьміна Н. І., Дзямідава Ф. А. (Шклоўскі раён); Елісеева С., Харчынскага В. І., Малкіеля М. К., Лугрынкова Н. М., Цывількова Ф. А. (Чаўсускі раён); Зінгера І. А., Тарэнда В. І., Белякова В. Л., Лістапада М. М., Міронава М. Д.; Мельникава Е. А. (Бялынічскі раён); Бабарыка Т. В., Касцян І. Е. (Клічаўскі раён); Васількова К. Е., Ігнаценка І. Ю., Ужакова Л. І., Фурадзеева П. Я., Новікава Н. А., В'юнова А. А. (Прапойскі раён); Поцюс Л. П., Чычкіна В. М., Радкевіча П. А., Рэпікава А. Е. (Магілеўскі раён); Назарава М. І., Бугаева П. В., Клімянкова А. І., Таранкова М. Я., Шуранкова П. І., Хадасоўскага М. Д., Козыра Е. Д. (Рагачоўскі раён); Багаткевіча Н. Я. (Ушацкі раён); Кірасова, Юдзінкага Я. М. (Чэрвоненскі раён); Кодзіцкага П. Д., Сухарава М. С.; Вуйцінка В. Г., Данчанка М. П., Пчарбакова А. Г., Кавалёнка С. П., Гоцманава Г., Панкова А. Я., Іванова В. Ф., Ваннштэйна Б. С., Пчэранава В. І. (Полацкі раён); Фамлюка І. І. (Расонскі раён).

3-та лістапада.

Карпенка Г. Е., Тарасенка К. (Дубровенскі раён); Заяніна С. С., Бакапоўскага П. К., Федаровіча П. М., (Мсціслаўскі раён); Мазурэнка І. Г., Жураўкава І. Ф., Резнікавай Ф. М., Чэркана Л. З., Мінькова В. К., Хомчанка А. П., Сяргеенка Ф. Л., Новікава А. С., Новікава Ф. С., Асмалоўскага В. І., Харытонава М. С. (Клімавіцкі раён), Моделева Н. Л., Барысёнак М. Ф. (Чырвонапольскі раён); Цараво А. Л., Барчэвіча А. Н., Апанасенка Г. П., Чернышова П. І. (Чашніцкі раён); Пятрова Н. В., Тарасенка П. П., Гарбачова В. П., Маслоўскага Ф. А., Лабуцова П. М., Тарасава Н. М., Саробіна І. П., Тумановіча І. С. (Горацкі раён); Сушко М. М., Кузьміна А. А., Лісоўскага С. А., Селядцова К., Асіповіч С. Я., Барнаўскага Э. А. (Талачынскі раён); Серакова А., Барысевіча Н. М., Маскалёва П. М. (Касцюковіцкі раён); Рэдуто П. Н., Пашкевіча Н. М., (Сенненскі раён); Скавінскага Н. А., Ляха А. П., Баумштэйна Г. Н., Вежыка Ф. П. (Лепельскі раён); Капэла В. Ф., Цітова М. В. (Крычаўскі раён); Сідарэнка Ф. С., Вараб'ёва Т. А., Кавалёва І. А., Мельникава І. С., Шылко С. М., Халамеева А. Н. (Чэрыкаўскі раён).

4-та лістапада.

Круцянкова М. Я., Трэцякова С. Н., Слёзкіна Г. Т., Левіта З. М., Лугоўскага І. І., Галушкова А. Д., Бусевіча З. Я., Бараўля Г. С. (Аршанскі раён); Кандрацьева С. А. (Гарадокскі раён); Краўцова М. Д. (Бешанковіцкі раён); Аксёнава І. А., Матросава К. А., Скачкова Д. С., Ісаева Г. Б., Пэра П. М., Ігнаценка П. К., Будніка І. В., Гінзбурга Н. Д., Оліна А. Ф., Дэйча Л. М., Хоміча К. Ф., Садчука Д. І., Кіршына П. С., Ліцкоўскага З. З., Боўшавера Б. М., Сікорскага Н. І., Забежынскага М. А., Палячанка Д. І., Дзянісорскага З. І., Касцюгера Т. І., Аршанскага С. С., Небаравіка І. Е. (Віцебскі раён); Шурынава Я. В., Халатоўкіна Ф., Власкоўскага П. Д. (Лёзненскі раён); Шаркевіча В. А. (Расонскі раён).

Яўка вышэйпамянёных таварышоў абавязкова, прычым апошнія павінны прадставіць водгукі аб сваёй апошняй рабоце ад islaвых партарганізацый.

Непаведамленне прычын няяўкі таварышоў у ПК па выклику прымушае здаць іх справы ў архіў без разгляду.

Партколегія КПК па БССР.

Партколегія КПК па Беларускай ССР просіць з'явіцца ў парткалегію КПК (Менск, памяшканне ЦК КП(б)Б, 2 паверх, пакой 34) або паведаміць свой адрас, месца работы і жыхарства Барчака Нікалая Іванавіча (працаваўшага раней у Жлобінскім раёне).

Просьба да ўсіх таварышоў і арганізацый,ведаючых месца прабывання тав. Барчака Н. І., паведаміць ПК КПК.

Партколегія КПК па Беларускай ССР.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

Дом партактыва пры Менгаркоме КП(б)Б паведамляе, што пропеміянары 29 кастрычніка не адбудуцца ў сувязі з надыходнем 8 пераносніка на 31 кастрычніка 1934 г. у 19 гадзін.

Пасля семінара адбудзецца даклад нам. сакратара ГК КП(б)Б т. Хадасевіча: «Гасдарчча-палітычныя мерапрыемствы па гораду і раёну».

Дом партактыва пры ГК КП(б)Б.

Сёння, 26 кастрычніка ў 7 гадзін вечара ў рэдакцыі «Звязда» (Совецкая 63, III паверх, габінет рэдактара) адбудзецца

нарада старшынь дэпутацкіх груп прадпрыемстваў горада

На нараду запрашаюцца: ад завода імя Варашылава — тав. ПАГОСКІ, ад завода «Комунар» — т. АКУЦЕНКА, «Большэвік» т. МАЖЭЙКА, імя Молатава — т. ТОЦІЕ, імя Мяснікова — т. ЛАТАГУРСКІ, завода «Ударнік» — т. ГІТЛІЧ, панцугоў Галля — т. АНДРОНАЎ, «Чырвоная зара» — т. НІСЕНБАУМ, фабрыкі «Окцябр» — т. ЦЭНТНЕР, абутковай імя Кагановіча — т. БАРСУК, «Комунарка» — т. ДЗЯМЕНЦЕЎ, шчотачнай — т. САВІНКОВА, друкарні імя Сталіна — т. ФЕЛЬДМАН, ф-кі імя 8 сакавіка — т. АВЕРБУХ, скарняжнай — т. ВАЛЧЭГУРСКІ, фабрыкі «Усход» — т. МЕРКІНА, электрастанцыі — т. КАЧАН, хлебакамбінята—т. ГРАБАВЕЦ, фабрыкі «Чырвоны тэкстыльшчык» — т. КАНЕР і старшыні дэпутацкіх груп менскага вузла чыгункі.

На нараду таксама запрашаюцца тт. Макрушыц, Багданава, Гэнчарык (бытавая секцыя), Гарбаўоў (комунальная секцыя), Тамаровіч (фінансавая секцыя), Зубовіч, Шапавалава і Лаут (секцыя аховы здароўя), Крыштафовіч і Бікава (кааперацыйна - гандлёвая секцыя), Наўменак (секцыя асветы), Максімовіч (ваенная секцыя), Родман (секцыя працы), Марголіна (жыллёвая секцыя), Ю. Гурвіч (секцыя рэволюцыйнай законнасці), Ханенкес (секцыя сувязі), Калінноўскі і Волкава (секцыя сабеза), Латагурскі, Скок і Корзун (секцыя чыгуначнікаў), Вензель (будаўнічая секцыя).

У парадку дня нарады:

Аб масавай праверцы выканання Менскім горсоветам наказу выбаршчыкаў

Адказны рэдактар Н. ЛЕНЦНЕР.

МЕНСК

ВЕЧАР СУСТРЭЧЫ КАЛГАСНІКАЎ З ПІСЬМЕННІКАМІ

26 кастрычніка ў Доме пісьменніка адбыўся вечар сустрэчы ўдзельнікаў першага ўсесаюзнага з'езда совецкіх пісьменнікаў са знатнымі людзьмі калгасных палёў Менскага раёна.

На вечары прысутнічалі сакратар гаркома партыі тав. **Рыскін**, нам. старшыні праўлення саюза совецкіх пісьменнікаў БССР тав. **Александровіч**, загадчык аддзела культуры і прапаганды ленінізма гаркома тав. **Варончанка**, народныя паэты рэспублікі **Янка Купала** і **Якуб Колас**, пісьменнікі **Чорны, Лынькоў, Крапіва, Зарэцкі, Гурскі**, яўрэйскі паэт **Харык**, праф. **Бранштэйн** і інш.

Калгаснікі-ударнікі, лепшыя брыгадзіры, даяркі расказалі аб тым, як яны ўсвоілі і ўдасканалілі перадавы дасведчаны гаркома і ЦК КП(б)Б заняткі рабочых Менскага раёна на ўсесаюзную чырвоную дошку.

З прамовай выступіў сакратар Менгаркома КП(б)Б тав. **Рыскін.**

Перад тым, як заліць асфальтам прыгатаваны плац кладзецца брук.

ПІСЬМЕННІКІ Ў ТАВ. РЫСКІНА

27 кастрычніка сакратара Менгаркома КП(б)Б тав. **Рыскіна** наведала дэлегацыя совецкіх пісьменнікаў БССР у складзе тт. Александровіча, Лынькова, Гурскага, Гартнага, Зарэцкага, Чорнага, Крапівы і Аксельрода.

Тав. Рыскін расказаў пісьменнікам, як Менскі раён дабіўся поспехаў у выкананні раду гаспадарча-палітычных мерапрыемстваў.

Пісьменнікі цікавіліся, як абстаіць справа з культурным будаўніцтвам у раёне.

Тав. Рыскін выказаў пажаданне, каб пісьменнікі прынялі ўдзел у напісанні гісторыі Менска. (БЕЛТА).

⊙ ⊙ ⊙

★ **ЗААЛАГІЧНЫ САД** арганізуецца ў Менску ў 1935 г. СНК абавязаў горсовет абгаварыць пытанне аб адводзе тэрыторыі для заалагічнага сада.

★ **ВЫСТАЎКА «КАТАРГА І ССЫЛКА»** адкрываецца па ініцыятыве ЦК Моцра БССР у габінеце замежных рабочых пры клубе імя Сталіна.

★ **ПЕРШЫ ЭЛЕКТРАПАТАЭФОН** выпускцца арцель «Точная механика». Прадажная цана электрапатэфона 140 р. Арцель пачала падрыхтоўку да масавага выпуску электрапатэфонаў.

Рамешк. БДТ—1 тэл. 24905 **Белд яржэ тр Оперы і Балета**
СЁННЯ.
ОПЕРА
ПІКАВАЯ ДАМА
у 4 дз., муз. чай-оўскага.
Пастаўлена на рэжысёра Мask. масгацн. тэатра ІВК СССР імя Мачэіна Горк гаБ. А. Мардзінава. эфарм. мастака П. В. Вільямса.
Пачатак роўна ў 8 гадзін веч.
Білеты ў касе тэатра з 12 да 2 гадзін і з 5 да 8 гадзін веч. У рабочай касе—з 12 да 2 гадзін і з 4 да 6 гадзін веч.
Грымяючыя заявкі ад ФЗМК на культпаходы і сядзячы месцы для ударнікаў.

ГУКАВЫ кіно-тэатр **«ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА»** | **ПЕРШАЕ КАХАННЕ** Зменчы мастацкае **Отто ФЛАНДАРДЗІ**

Гукавы кіно-тэатр **„Пролетарый"** | Мастацкі фільм **ДЖАЛЬМА** Канцэрт Ускодн. ансамбля

Кіно **„Інтэрнацыянал"** | Совецкі мастацкі фільм **ПАЭТ І ЦАР**

Кіно **„СПАРТАК"** Ад 28 кастрычніка
Вядомы выдатны фільм
Капыз Екцерыны Другой
Драма ў 7 частках.
У праграме—кіно-хроніка
Штодзённа 4 сеансы.
Каса—з 4-х гадзін дня.

Адзінокаму **ПАТРЭБЕН невялікі ПАКОЙ.**
Паведаць у цэнтры. Аплата па згодзе аб умовах звяніць па тэлефону 21-360

2-га лістапада ў 6 гадзін вечара ў клубе імя СТАЛІНА (рог Інтэрнацыянальнай і Комсамольскай)
адкрываецца
ПЕРШЫ ЎСЕБЕЛАРУСКІ ЗЛЁТ ЗНАТНЫХ ЛЮДЗЕЙ ЛЕСУ, СПЛАВУ І ПАДСОЧКІ.
Рэгістрацыя прыбыўшых дэлегатаў і гасцей у памяшканні БРК саюза (Дом прэсы, 3-ці паверх, пакой 5).
Дэлегатаў і прыбыўшых гасцей сустракаюць на вакзале пікетныя БРК саюза.
Прэзідыум БРК саюза лесу і сплаву.

ЦЫРКАВОЕ ЭТРАД ДЕ БЮРО
Наркомзсветы БССР даводзіць да ведама ўсіх культаддзелаў саюзу, загадчыкаў клубамі, фабзаўкомаў і інш. зацікаўленых арганізацый, што з 5 кастрычніка
ЦЭБ'ам прымаюцца заяўкі на мастацкае абслугоўванне артыстычнымі сіламі Окцябрскіх свят.
Для мастацкага абслугоўвання окцябрскіх свят спецыяльна запрашаюцца артысты вышэйшай кваліфікацыі як БССР, так і іншых рэспублік наступных жанраў: юмар, сатыра, скетчы, ансамблі, цырк, балет, інструментальны і інш.
Прыём заявак штодзённа з 10 гадзін раніцы да 4 гадзін дня ў памяшканні ЦЭБ, клуб Соўгандальслужачых (рог Энгельса і Комуністычнай, пакой № 8, тэл. 22-755).
ЦЭБ.

Друкарні „ЗВЯЗДА" **патрэбны ВАРТАУНІКІ**
для аховы друкарні,
грыёшчыкі на ратацыйнай машыне і вучні-лінатыпісты.
Звяртацца: Совецкая, 63, II-гі паверх, да дыректара, з 12 да 1 гада дня.

Навучальны камбінат ВОСУ
АБЪЯЎЛЯЕ
НАБОР КУРСАНТАЎ
НА 6-МЕСЯЧНЫЯ **КУРСЫ**
па падрыхтоўцы 2-х груп **бухгалтароў** для раённай сістэмы **Белкаапрамсовета.** Стыпендыя ад 100 да 150 руб. у месяц і кватэрных 25 р. Інтэрнат курсанты не забяспечваюцца. Курсанты прымаюцца да стаўлоў. Прымаюцца асобы, мэтныя рахункоўны стаж не менш 1 года, з адукацыяй за 7 класаў. Да заяў дадаць дакументы аб сацыяходжанні, адукацыі, прапоўным стажы, узросце, вызваленні ад працы, аб адносінах да вайсковай службы і на 40 кап. марак. Заявы без усіх дакументаў не разглядаюцца. Заявы прымаюцца у канцылярыі камбіната ВОСУ (Менск, Революцыйная, 3) да 20 лістапада ад 10 да 12 г. дня.
Аб залічэнні будзе паведамлена па пошце.
Дырэкцыя.

У ноч з 2 на 3 лістапада з 1-й да 3-х гадз. ночы
Народны камісарыят асветы, ЦП саюза працасветы і ЦК ЛКСМБ *праводзяць*
УСЕБЕЛАРУСКУЮ РАДЫЁ-ПЕРАКЛІЧКУ
ПА ПЫТАННЮ ўключэння культасветных устаноў у выторчы паход імя XI усебеларускага і VII усесаюзнага з'ездаў Советаў і падрыхтоўкі да святкавання XV гадавіны Окцябрскай рэволюцыі
Ля мікрафона—загадчык аддзела культуры і прапаганды ленінізма ЦК КП(б)Б т. ОНІК, народны камісар асветы БССР тав. ЧАРНУШЭВІЧ, старшыня ЦП саюза працасветы тав. ГРЫЦКЕВІЧ і сакратар ЦК ЛКСМБ тав. АУГУСТЭЙШІС.
Жыр. сіх заг. ВНО, старшынь РК саюза працасветы і сакратароў РК ЛКСМБ на месцах перыферыі абавязкова.
Прапануецца арганізаваць слуханне асветніцкім і комсамольскім актывам.
НАРКОМАСВЕТЫ БССР,
ЦП САЮЗА ПРАЦАСВЕТЫ,
ЦК ЛКСМБ.

ПАСТАНОВА

прэзідыума праўлення Белкаапсаюза

22-X-34 года г. Менск

АБ ХОДЗЕ ІЛЬНАЗАГАТОВАК

1. Рад сур'ёзных папярэджанняў ЦК КП(б)Б, СНК і прэзідыума БКСаюза аб неабходнасці па-большавіцку арганізаваць справу пераапрацоўкі і загатоўкі ільнопенькапрадукцыі не знайшлі свайго адлюстравання ў практычнай рабоце часткі райсгакмуўсаюзаў, якія ганебна зрываюць выкананне плана загатовак ільновалакна. На 20 кастрычніка г. г., пры сярэднім выкананні плана ільновалакна па раёнах, абслугоўваемых спажыўсістэмай, на 19,2 проц., Нараўлянскі РСС (старшыня тав. **Адзінец**), выканаў усяго на 4 проц.; Петрыкоўскі РСС (**Ліўшыц**), Райзагатовка (**Котляр**)—4,6 проц.; Камарынскі (**Сямашка**)—4 проц.; Ельскі (**Корж, Месніч**)—5,9 проц.; Клічаўскі (**Юдкін, Салтан**)—7,8 проц.; Стара-Дарожскі (**Вербін**)—9,6 проц. Усё гэта паказвае аб абсалютнай бяздзейнасці гэтых кіраўнікоў РСС і райзагатовак у справе ільнозагатовак.

2. Адзначыць, што райспажыўсаюзы не выканалі поўнасцю пастанову ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб пераключэнні ўдвая ручной пераапрацоўкі ільну не менш 50 проц. рабочай сілы ў калгасах, скарыстаўшы поўнасцю ільнаапрацоўчыя машыны.

3. Ганебнае выкананне плана ільнозагатовак па раду РСС з'яўляецца вынікам яшчэ і таго, што сельпо не прыцягнуты для арганізацыі ільнозагатовак і не ўзначальваюць гэту важнейшую справу на вёсцы.

4. Не гледзячы на добраякасны выхад ільну па рэспубліцы (па раёнах спажыўсістэмы № 8,6), ад раёнаў даюць нізкі выхад якасна-нумаражу ільновалакна: Камарыны—5,1 проц., Нараўля—6,6 проц., Петрыкаў—6,2 проц. Паказанае свядчыць, што не ўсімі райсаюзамі, калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў па арганізацыі первічнай пераапрацоўкі, сартаванні і падвязкі валакна.

Прэзідыум Белкаапсаюза **пастанаўляе:**

1. За зрыў загатовак ільновалакна абвясціць суровую вымову старшыні Камарынскага РСС тав. **Сямашка** і Ельскага РСС тав. **Каржу.** У адносінах тав. **Вербіна**—Стара-Дарожскі РСС—улічыць, што ён прэдыдумам знят з работы за зрыў плана хлебазакупак.

2. Папярэдзіць старшынь РСС і дырэктароў райзагатовак—Нараўлянскага, Петрыкаўскага, Клічаўскага і ўсіх астатніх адстаючых раёнаў,—што калі на працягу бліжайшай пяцідзённкі яны не зробяць рашучага перастрогія меры спагнання, аж да зняцця з работы і прыцягнення да судовай адказнасці.

3. Абавязаць старшынь РСС і дырэктароў райзагатовак:

а) прыцягнуць да арганізацыі загатовак ільнопенькапрадукцыі ўсіх стаўшынь сельпо;

б) правесці праз сельпо растлумачальную работу сярод калгаснікаў аб неадкладным пераключэнні не менш 50 проц. рабочай сілы для пераапрацоўкі ільнопенькапрадукцыі;

в) на ўсіх прыёмных пунктах, а таксама па калгасах правесці неадкладна інструктаж па арганізацыі первічнай пераапрацоўкі, сартаванню і падвязцы валакна;

г) разлікі за прымаемую продукцыю рабіць зараз-жа пры прыёме і забяспечыць выдачу авансаў ільнопенькапрадукцыі стымулюючых пром. і продтавараў (хлеб, расліннае масла і інш.).

4. Дырэктару аб'яднання Белкаапсыравіны тав. **Эйманасу** устанавіць пастаянны кантроль на кожным раёну паасобку і кожныя 5 дзён інфармаваць старшыню праўлення аб ходзе выканання плана па кожнаму раёну і відах прадукцыі.

5. Даручыць тав. **Матусевічу** ўзмацніць завод тавараў на стымулюванне ільнозагатовак.

Старшыня прэзідыума праўлення Белкаапсаюза БАСКІН.

ПАСТАНОВА № 17

Прэзідыума Менскага Гарадскога Совета ад 26.X-34 г.
Аб заверцы стандартных даведак на атрымання наборных дакументаў.

У сувязі з пастановай СНК БССР аб астабанненні міліцыі ад заверкі стандартных даведак на атрымання наборных дакументаў асобам, пражываючым у прыватных дамах, прэзідыум Менгорсовета

ПАСТАНАЎЛЯЕ:

Да арганізацыі квартальных камітэтаў ускладзіць заверку стандартных даведак асобам, пражываючым у прыватных дамах у раёне жакта—на жакты.

Старшыня Менгорсовета ЖУКОВІЧ.

Сакратар Менгорсовета ІПАТАЎ.

Выпускаючы — КРУЧКОЎ, ст. карэктар — БЯРОЗАВІК, ст. метранпаж — Н. ПЕРАКЛАДНЕЎ, ст. стэрэатыпёр — ПЕДЗІКАЎ, ст. друкар — АНУЧЫН.
Менск, друкарня «Звязды».
Уп. Галоўлітбела № К—3280